ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ІНТЭРНЭТ-АШУКАНЦАЎ 5

ПАЭЗІЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ 10–11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 СНЕЖНЯ 2023 г. СУБОТА № 244 (30124)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Мы чакаем, што ў бягучым годзе аб'ём выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі складзе каля $29 млрд. Яшчэ два гады таму было каля $26-27 млрд, г. зн. за год мы дабавім $2 млрд. У наступным годзе мы павінны выйсці за $30 млрд. Гэта тое, што нам заўсёды было неабходна, але не хапала такога штуршка (якім стала ўвядзенне санкцый), каб гэтым займацца. Заняліся ў сілу абставін, і гэта дае свае вынікі. Такія працэсы запушчаны па ўсіх напрамках: пачынаючы ад мэблі і заканчваючы самымі простымі вырабамі. Вядома, простыя яны толькі на першы погляд, бо раней усё гэта завозілася па імпарце, што, па-першае, адмоўна ўплывала на наш плацежны баланс, а па-другое, фактычна мы аддавалі грошы іншым краінам. Цяпер гэтыя сродкі застаюцца тут, з іх плацяцца падаткі тут».

Гэткі жвавы «Чабарок»



Юныя артысты заслужанага аматарскага калектыву ўзорнага ансамбля танца «Чабарок» пад кіраўніцтвам кіраўніка калектыву Анастасіі Дзягель развучваюць танец «Мышка-рагатушка», з якім выступяць у чароўнай навагодняй казцы «Папялушка.бай» 22 снежня ў Мінску.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАРАТКА

- ДПК: больш за 66 тысяч грамадзян Украіны заехалі ў Беларусь з пачатку года.
- **Турэцкая авіякампанія пачынае палёты са Стамбула ў Мінск.**
- Завод па вытворчасці звадкаванага прыроднага газу плануюць пабудаваць у Беларусі.
- **Беларусь і Расія падпісалі праграму ўзгодненых дзеянняў у знешняй палітыцы да 2026 года.**
- Больш за 70 адзінак складанага абсталявання плануецца паставіць на пляцоўкі холдынга «Гомсельмаш» у 2024 годзе.
- **У Беларусі пачалася раптоўная праверка дзяжурных сіл ВПС і СПА.**

Вандроўка патрыётаў

Песня пра зубра на новы лад

Якія сакрэты гасцям раскрывае Белавежская пушча

У каго ні спытай пра асноўныя славутасці Беларусі, кожны сярод пераліку розных цікавых месцаў абавязкова назаве Белавежскую пушчу. Унікальны і ад таго самы знакаміты лес не толькі Беларусі, але і ўсёй Еўропы, гасцінна запрашае турыстаў. Самыя запаветныя таямніцы ён, канешне, гасцям цне раскрые. Але і цікавостак адкрытых для турыстаў цалкам хопіць, каб упэўніцца, што Белавежская пушча — месца надзвычайнае і нават чароўнае. У гэтым маглі ўпэўніцца і ўдзельнікі выязнога семінара ад Нацыянальнага агенцтва па турызме, сярод якіх былі і карэспандэнты «Звязды».

СТАР. 13

Дзяржаўны інтарэс

КОСМАС — ЛАКАМАТЫЎ ДЛЯ СТВАРЭННЯ НОВЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ, ТЭХНАЛОГІЙ І НОВЫХ РАШЭННЯЎ

Тое, што працуе там, на Зямлі будзе працаваць яшчэ больш надзейна

Айчынная навука сёння самым цесным чынам інтэграваная ў беларускую эканоміку. За вучонымі — суправаджэнне ўсіх бакоў развіцця новай, заснаванай на ведах эканомікі, у тым ліку і касмічнай галіны. Восенню 2022 года ў НАН Беларусі рашэннем Бюро Прэзідыума Акадэміі быў створаны кластар «Навукова-вытворчая карпарацыя «Белкосмас», у якую ўвайшлі як арганізацыі Акадэміі навук, так і арганізацыі, з якімі НАН Беларусі ажыццяўляе супрацоўніцтва. Пра тое, як развіваецца касмічная галіна, як рыхтуюцца да касмічнага палёту беларускія дзяўчаты і чаму для нас так важна быць касмічнай дзяржавай, мы гутарым з прадстаўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Нашымі суразмоўнікамі сталі першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК, начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці НАН Беларусі, намеснік кіраўніка Агенцтва па касмічных даследаваннях, акадэмік Пётр ВІЦЯЗЬ і намеснік начальніка ўпраўлення аэракасмічнай дзейнасці Іван БУЧА.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Дзяржаўны інтарэс

ПРАЦАВАЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ І НА ВЫНІК

У Віцебску пад кіраўніцтвам Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі

Выязное пасяджэнне было прысвечана перспектывам развіцця лёгкай прамысловасці нашай краіны і прайшло ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, які з'яўляецца вядучай ВНУ па падрыхтоўцы кадраў для гэтай галіны. Старшыня Савета Рэспублікі азнаёмілася з навучальнымі лабараторыямі, дзе хлопцы і дзяўчаты спасцігаюць асновы стварэння абутку, адзення, а таксама нанавалакністых матэрыялаў, паразмаўляла з моладдзю.

Фота БелТА.

Як высветлілася, у ВНУ атрымліваюць адукацыю не толькі жыхары Віцебскай вобласці, але і іншых рэгіёнаў, Расіі. Матываванасць выпускнікоў школ, іх зацікаўленасць у атрыманай прафесіі, попыт на навучанне ў адной з вядучых віцебскіх ВНУ — гэтыя пытанні таксама былі разгледжаны падчас пасяджэння.

«Трэнды трэба задаваць самім»

Кажучы аб перспектывах развіцця лёгкай прамысловасці ў нашай краіне, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што для таго, каб развівалася гэтая галіна, неабходны кадры. «Таму мы прынялі рашэнне правесці выязное пасяджэнне менавіта ў тэхналагічным універсітэце горада Віцебска — у адзінай ВНУ краіны, дзе рыхтуюць спецыялістаў для гэтай галіны, — патлумачыла яна. — Вядома, у нас ёсць спецыяльнасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, іншых навучальных установах, але так канцэнтравана, вядома, у гэтай ВНУ. Тут добрыя традыцыі, добрая школа, добрыя педагогі, тыя, хто сёння працуе са студэнтамі, добрыя лабараторыі, ёсць інтэрнаты. Мы разумеем, што для таго каб прыйсці вучыцца сюды, хлопцы і дзяўчаты павінны ведаць, якая гэта выдатная ВНУ. Таму мы сёння тут. Я думаю, што пасля пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета хтосьці прыме рашэнне і прыйдзе вучыцца сюды».

Спікер верхняй палаты звярнула ўвагу, што ў навучальнай установе атрымліваць адукацыю маладыя людзі з Расійскай Федэрацыі. «Яны кажуць, што попыт на гэтую адукацыю ў нашых суседзяў ёсць, яны актыўна сюды прыязджаюць, бо разумеюць, што тут добрая школа», — заўважыла Наталля Качанава.

У час выязнога пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі ўдзельнікі наведалі выставу «Беллегпрама», а таксама ВНУ і ССНУ, якія рыхтуюць кадры для лёгкай прамысловасці, азнаёміліся з работамі маладых дызайнераў, аспірантаў універсітэта. Калекцыя з экаскуры, якая цяпер з'яўляецца папулярным матэрыялам у аматараў модных брэндаў, прыцягнула ўвагу многіх. «Трэнды трэба задаваць самім», — падкрэсліла Наталля Качанава, ацаніўшы крэатыўны падыход перспектыўных талентаў з Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Таксама на выставе былі прадстаўлены адзенне, абутак, сумкі, галантарэя, якую выпускаюць вядучыя прадпрыемствы «Беллегпрама», уключаючы тавары для дзяцей і спецыяльнага прызначэння, напрыклад, спецадзенне.

«Развіваць далей тэхналогіі, мадэлі мы проста абавязаны»

Падчас пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што лёгкая прамысловасць нашай краіны — гэта той кірунак, які традыцыйна славіўся сваімі таварамі, што выпускаюць нашы прадпрыемствы. «Мы заўсёды гэтым ганарыліся, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Нават у часы Савецкага Саюза мы ведалі, што ў нас добрыя прадпрыемствы, якія выпускаюць дастаткова якасную прадукцыю. Сёння гэта дакладна так. Але развіваць далей тэхналогіі, мадэлі мы проста абавязаны».

Па словах спікера верхняй палаты парламента, адным з галоўных дасягненняў суверэннай Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беражлівыя адносіны да найлепшай савецкай спадчыны. «У нашай краіне захавалася большасць буйных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, на якіх стваралася сучасная галіна, — нагадала яна. — І сёння гэта стратэгічны сегмент народна-гаспадарчага комплексу нашай краіны, які аб'ядноўвае звыш дзвюх тысяч арганізацый, дзе заняты больш за 82 тысячы нашых грамадзян. Большая частка прадпрыемстваў мадэрнізавана, падтрымліваецца сістэма міжгаліновага ўзаемадзеяння, наладжаны экспартныя сувязі з многімі краінамі. Гэта стварае стабільную аснову для нармальнага функцыянавання галіны. Аднак, нягледзячы на развітую вытворчую базу, айчынны легпрам сутыкаецца з шэрагам цяжкасцяў».

Наталля Качанава адзначыла, што Прэзідэнт надае асаблівую ўвагу гэтай сферы. Сведчанне таму — бюджэтная падтрымка, якая па рашэнні кіраўніка дзяржавы аказваецца прадпрыемствам галіны для мадэрнізацыі і забеспячэння іх рытмічнай работы. «Цяпер на кантролі знаходзяцца 23 даручэнні Прэзідэнта нашай краіны, — канкрэтызавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы ведаеце, што ён наведваў практычна ўсе прадпрыемствы, якія функцыянуюць сёння ў гэтай галіне, і ўсюды былі дадзены сур'ёзныя даручэнні па мадэрнізацыі. Выкананне даручэнняў Прэзідэнта павінна быць краевугольным каменем на кантролі ў рэспубліканскіх органах кіравання. І, вядома, мы, члены Савета Рэспублікі, актыўна займаемся гэтымі пытаннямі».

Удзельнікі пасяджэння выпрацавалі дарожную карту, вызначылі, што яшчэ трэба зрабіць па рэалізацыі пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач.

Кадры, насычэнне ўнутранага рынку і экспарт

Наталля Качанава заўважыла, што ключавой умовай для ўстойлівага развіцця любога прадпрыемства з'яўляюцца прафесійныя і матываваныя кадры. «Сёння ў Беларусі патрэба ў кадрах для гэтай галіны забяспечваюць 5 універсітэтаў, 15 устаноў сярэдняй спецыяльнай і 48 прафесійна-тэхнічнай адукацыі, — удакладніла яна. — На маю думку, навучальных установаў хапае. Галоўнае сёння — матывацыя дзяцей прыйсці вучыцца ў гэтыя ВНУ. Нам сёння трэба паглядзець, наколькі актуальна тое, што некаторыя папулярныя спецыяльнасці адкрываюцца ў такіх вядучых ВНУ, як БДУ і іншыя. Можа, не варта гэтага рабіць? А лепш займацца гэтым там, дзе ёсць прафесійныя кадры, дзе ёсць база для гэтага: лабараторыі і ўсё астатняе».

Па словах спікера верхняй палаты парламента, патрэбна абараняць сваіх таваравытворцаў. «Бягучыя тэндэнцыі ў сусветнай эканоміцы і палітыцы падштурхоўваюць нас да інтэнсіўнага развіцця свайго ўнутранага рынку перш за ўсё шляхам насычэння запатрабаванай нашымі грамадзянамі якаснай прадукцыяй, а таксама да яго комплекснай абароны ад нядобрасумленных канкурэнтаў, — заўважыла яна. — Такая задача была пастаўлена Прэзідэнтам нашай краіны. І, вядома, мы павінны прасоўваць тавары, якія выпускаюць нашы прадпрыемствы».

Найважнейшым кірункам з'яўляецца экспарт. «Унутраны рынак мы абавязаны насыціць якаснымі таварамі і асартымент вытрымаць — гэта наша асноватворная задача, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Але для нас вельмі важны экспарт. Таму трэба пашыраць лінейку краін для супрацоўніцтва. Я ведаю, што канцэрн «Беллегпрам» вельмі актыўна працуе ў гэтым кірунку, выязджае ў розныя краіны. Вы ведаеце, Прэзідэнт нашай краіны здзейсніў такі вялізны прарыў, калі наведаў краіны Афрыкі. Там трэба ўсё. Таму мы сёння павінны актыўна працаваць у гэтым кірунку, асвойваючы новыя рынкі для паставак нашай прадукцыі».

Парламентарыі актыўна падтрымліваюць усе задачы, якія стаяць перад нашымі прадпрыемствамі і галінамі ў цэлым. «Мы разглядаем гэтыя пытанні ў рамках міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва з МПА СНД, Парламенцкім Сходам Саюза Беларусі і Расіі — там, дзе мы можам і прымаем вельмі важныя рашэнні, — паведаміла спікер. — Зусім нядаўна ў Бішкеку, дзе праходзіла чарговае пасяджэнне сесіі МПА СНД, мы разглядалі праект, які сябе ўжо добра зарэкамендаваў, — «Сядружнасць моды». Па прапанове канцэрна «Беллегпрам» мы дамовіліся аб тым, што будзе створана рабочая група, у якую ўвойдуць не толькі члены Савета Рэспублікі і сенатары Расійскай Федэрацыі, але і спецыялісты, якія ўзначальваюць кірункі лёгкай прамысловасці ў нашых краінах, для таго, каб адпрацоўваць сумесныя праекты і бачыць найлепшыя дызайнерскія работы».

Цяпер такі форум штогод будзе праводзіцца пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Засуха ў Панамскім канале затрымае судны са збожжам да 2024 года

Пастаўшчыкі сельскагаспадарчай прадукцыі з ЗША сутыкаюцца з праблемамі з-за перагружанасці і высокіх транзітных збораў у Панамскім канале. Пра гэта паведаміла Reuters. Праблема на адным з асноўных марскіх гандлёвых шляхоў у свеце ўзнікла ў самы пік сезона экспарту сельгаспрадукцыі. Абмежаванні могуць працягваць перашкаджаць перавозцы збожжа яшчэ доўгі час, магчыма, да 2024 года, калі пачнецца сезон дажджоў у рэгіёне, і ў красавіку-маі суднаходства вернецца да нормы, адзначылі аналітыкі. Цяжкасці з дастаўкай збожжавых прыводзяць да перагляду маршрутаў, з павелічэннем затрат на паліва і арэнду суднаў. Цяпер дазволены ўсяго 22 штодзённыя транзіты, у параўнанні са звычайнымі ўмовамі, калі іх было каля 35. Да лютага іх колькасць яшчэ скароціцца да 18 за дзень. Грузавыя судны са збожжам часта стаяць у канцы чаргі, бо яны звычайна шукаюць транзітныя слоты ўсяго за некалькі дзён да прыбыцця, у той час як іншыя, такія як круізныя і кантэйнерныя судны, браніруюць іх за месяцы наперад. Гэта адбіваецца на гандлі збожжам, і судны вымушаны разглядаць доўгія абыходныя маршруты праз Паўднёвую Амерыку, Афрыку ці Суэцкі канал.

Давер жыхароў Вялікабрытаніі да палітыкаў апусціўся да самай нізкай за 40 гадоў адзнакі

Аб гэтым паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на даныя апытання, якое праводзіла сацыялагічная служба Ipsos. Вынікі даследавання паказалі, што ўсяго 9 % жыхароў краіны вераць палітыкам. Як адзначылі спецыялісты, гэты паказчык стаў рэкордна нізкім за апошнія 40 гадоў. Падкрэсліваецца, што сярод насельніцтва Лондана гэты паказчык склаў усяго 3 %, а сярод людзей ва ўзросце ад 25 да 34 гадоў — 2 %. Нізкі ўзровень даверу сфарміраваўся і да міністраў — усяго 10 % жыхароў краіны лічаць, што яны працягваюць даносіць праўду да грамадскасці. Пасля іх па ўзрастанні ідуць кіраўнікі рэкламных агенцтваў — 16 %, прадстаўнікі СМІ — 21 %, рыэлтары — 28 %. Аднак усе гэтыя паказчыкі ніжэйшыя за сярэднюю адзнаку ў 51 % — столькі жыхароў Вялікабрытаніі паверацъ простаму мінаку. Яшчэ 54 % апытаных перакананы, што прадстаўнікі духавенства таксама будуць казаць праўду. На выніках сацапытання быў сфарміраваны спіс прафесій з высокім узроўнем даверу. Гэта ўрачы і інжынеры, работнікі бібліятэк, пілоты і медсёстры — ступень даверу да іх вар'іруецца ад 85 да 88 %.

Папа Рымскі заявіў, што не збіраецца сыходзіць на спакой

Папа Рымскі Францыск у інтэрв'ю мексіканскаму тэлеканалу N+ заявіў, што не плануе сыходзіць на спакой і хоча быць пахаваным у рымскай базіліцы Санта-Марыя-Маджорэ, а не ў ватыканскіх гротах, як яго папярэднікі. Акрамя таго, днямі на традыцыйнай аўдыенцыі ў Ватыкане пантыфік зноў заклікаў да неадкладнага спынення агню ў сектары Газа і аднаўлення перагавораў, а таксама вызвалення заложнікаў. «Я прашу ўсіх узяць на сябе абавязацельствы па забеспячэнні таго, каб гуманітарная дапамога дасягнула жыхароў сектара Газа», — заявіў ён. Пантыфік таксама заклікаў вернікаў у перадкалядныя дні маліцца аб «мірыдля людзей, якія пакутуюць ад вайны». Як вядома, 17 снежня Папа Рымскі Францыск адзначыць свой 87-ы дзень нараджэння.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Івану Міхайлавічу Эйсманту ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Нашы дзеці

Час, калі збываюцца мары

У Нацыянальным парку «Белавежская пушча» далі старт рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці»

Фота БелТА.

Сёлета акцыя набыла новы фармат. На яе адкрыццё ў Белавежскую пушчу запрашэнні атрымалі 150 дзяцей, паведамляе БелТА. Кожная дэлегацыя паўдзельнічала ў квэсце і з дапамогай карты адшукала ў маёнтку беларускага Дзеда Мароза канверты з пасланнямі ад кожнай вобласці і горада Мінска. Гаспадар казачнай сядзібы паабяцаў выканаць усе мары і жаданні. Менавіта з самага сэрца запаведнага лесу быў дадзены старт навагодняй акцыі «Нашы дзеці». З Брэсцкай вобласці марафон дабра адправіўся па Беларусі. У фармаце тэлемоста да цырымоніі падключыліся Гродзенская, Гомельская, Магілёўская, Мінская, Віцебская вобласці і Мінск.

«Мы даём старт акцыі разам з усёй краінай. Ва ўсіх кутках нашай рэспублікі таксама ў прамым эфіры знаходзяцца дзеці і дарослыя, якія адпраўляюць у шлях экспрэс добрых спраў — акцыю «Нашы дзеці». Яна ідзе па краіне больш як 25 гадоў, ініцыіраваная нашым Прэзідэнтам. Мы бачым, што рэальна робіцца ў Беларусі для шчаслівага і камфортнага дзяцінства», — падкрэсліў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Ён адзначыў, што ў краіне вялікую ўвагу ўдзяляюць развіццю адукацыі і магчымасцям для творчасці юных беларусаў.

Напярэдадні Новага года цудаў і падарункаў чакаюць і дарослыя, і дзеці. «Пажылыя людзі таксама маюць патрэбу ў святе. Мы гэта свята ствараем і для іх. Літаральна праз тыдзень стартуе акцыя «Ад усёй душы», дзе мы павінны ўдзяліць увагу пажылым людзям сваім чулым стаўленнем, творчасцю, шчырымі і добрымі ўчынкамі», — сказаў віцэ-прэм'ер, цёпла павіншаваўшы ўсіх з зімовымі святамі.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА дадаў, што акцыя «Нашы дзеці» не пакіне без увагі ніводнае дзіця. «Мы любім вас. Наша краіна робіць усё, каб вы вучыліся, былі здаровыя», — падкрэсліў кіраўнік Брэсцкай вобласці.

Дзяўчынкі і хлопчыкі, якіх запрасілі на свята ў Белавежскую пушчу, апынуліся ў самай сапраўднай казцы. «Вельмі рада быць тут. Спадзяюся атрымаць шмат уражанняў, пазнаёміцца з равеснікамі з майго раёна. Цікава было пабываць зімой у Белавежскай пушчы, у маёнтку Дзеда Мароза. Хацелася б у яго папрасіць дабрабыту і прысмакаў», — расказала школьніца Кацярына Міхалькевіч.

Марына Русак да гэтага ні разу не была ў Белавежскай пушчы. Запрашэнне на свята ў дзень старту акцыі «Нашы дзеці» стала для яе вялікім сюрпрызам. «Тут прыгожа, як у казцы. Ніколі не была ў Дзеда Мароза да гэтага, але пісала яму лісты. У мяне ёсць просьба да яго, але пра яе прамаўчу — гэта сакрэт. Скажу яму асабіста», — прызналася дзяўчынка.

Ігар Петрышэнка ў дзень старту акцыі «Нашы дзеці» наведаў Відамлянскую сярэднюю школу ў Камянецкім раёне і падарыў інтэрактыўную дошку і ласункі.



Медыяпрастора

ХУТКАСЦЬ І ВЫСОКАЯ ПЛАНКА ЯКАСЦІ

У Мінску адбыўся X Форум маладых журналістаў «Журналістыка сёння: тэрыторыя адказнасці»

Удзельнікамі форуму сталі 220 маладых журналістаў дзяржаўных рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама эксперты ў сферы масмедыя. Апошнія выступілі з дакладамі, якія адлюстроўваюць актуальную сітуацыю ў медыясферы, прысвечанымі вялікім магчымасцям рэгіянальнай прэсы, запатрабаванасці і важнасці фатаграфіі ў журналістыцы, феномену папулярнасці кароткіх відэа ў сацыяльных сетках, беларускай блогасферы і экстрэмальнай журналістыцы. Форум, арганізаваны Міністэрствам інфармацыі, накіраваны на павышэнне кваліфікацыі, развіццё сацыяльнай і прафесійнай камунікацыі маладых журналістаў, фарміраванне адзінай медыясупольнасці Беларусі.

У размове з журналістамі **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** нагадаў, што ўся медыясупольнасць краіны знаходзіцца ў стане інфармацыйнай вайны. Па яго словах, у супрацьборства з прадстаўнікамі зразумелых і звыклых прафесій, журналістамі і ідэолагамі ўступілі тыя, каго журналістамі назваць нельга: медыяпадобныя блогеры, актывісты сацыяльных сетак, спецыяльна

Фота БелТА.

Форум маладых журналістаў завяршыўся ўрачыстай цырымоніяй узнагароджання пераможцаў другога рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код». Узнагароды маладым калегам уручаў Уладзімір ПЯРЦОЎ.

створаныя і структуры, якія мімікрыруюць пад СМІ, называюць сябе радыёстанцыямі і тэлеканаламі.

«Нашы апаненты вядуць агрэсіўную інфармацыйную палітыку па заваёве сэрцаў і розумаў маладых людзей, якія, гартаючы стужку сацсетак, не заўсёды могуць аддзяліць праўду ад няпраўды, — адзначыў кіраўнік ведамства. — Асабліва гэтае становішча небяспечнае цяпер, калі хуткасць пераважае над якасцю, над фактчэкінгам, да якога мы яшчэ нядаўна так заўзята звярталіся і не выдавалі інфармацыю, папярэдне яе не праверыўшы. Сёння, карыстаючыся каварнымі алгарытмамі сацсетак, апаненты вядуць досыць агрэсіўную работу па прасоўванні сваёй інфармацыі, якая ні на чым не заснаваная, але, тым не менш, выклікае негатыўныя эмоцыі ў людзей, што падахвочвае іх здзяйсняць правіны. Моладзь толькі пастфактум разумее, што павялася на фэйкі, укінутыя любімай псеўдаблогеркай або іншым інфлюенсерам, на якога маладыя людзі падпісаны ў месенджары або сацсетцы. Наша задача — не дапусціць гэтага».

Уладзімір Пярцоў арыентаваў маладых журналістаў не паддавацца на хітрыкі тых, хто знаходзіцца па той бок інфармацыйных барыкад, і напрацоўваць уменне ствараць кантэнт у новых лічбавых асяроддзях з прымяненнем сучасных інфармацыйных інструментаў. «Мы цяпер трымаем інфармацыйны парадак дня ў нашай краіне, а нашы апаненты глынаюць пыл, але нельга цешыць сябе, паколькі супраць нас сур'ёзная тэхналагічная машына, — заўважыў міністр. — Яна звяртаецца да несумленных метадаў па песімізацыі акаўнтаў і матэрыялаў, якія публікуюцца нашымі нацыянальнымі СМІ».

Міністр інфармацыі звярнуў увагу на прывабнасць кантэнту рэспубліканскіх СМІ: іх стужкі абнаўляюцца штохвілінна і мільгаюць шматлікімі паведамленнямі, якія фарміруюць інфармацыйны парадак дня. Пры гэтым нацыянальныя медыя ва ўмовах, калі хуткасць першасная, прымудраюцца правяраць інфармацыю і трымаць высокую планку якасці. Па словах кіраўніка ведамства, не ўсе рэгіянальныя СМІ дзейнічаюць па такім прынцыпе і значна саступаюць рэспубліканскім. «Дзесьці па аб'ектыўных прычынах, дзесьці з-за нежадання перабудоўвацца ці неразумення, як працуе лічбавае асяроддзе, дзесьці — каб не выходзіць з зоны камфорту: маўляў, мы прызвычаіліся рабіць друкаваную газету, калі нас прымусяць, мы перанясём той жа матэрыял у інтэрнэт і будзем думаць, што гэта будзе індэксавацца і кімсьці чытацца», — патлумачыў Уладзімір Пярцоў.

Менавіта па гэтых прычынах, адзначыў міністр, важна прыцягваць маладых журналістаў да працы ў рэгіёнах, каб яны дапамагалі рэдакцыям рэгіянальных газет адаптаваць створаны матэрыял для інтэрнэту, перапісваючы яго ад загалоўка да апошняга сказа лонгрыда або ствараючы тое, што цяпер знаходзіцца ў топе запытаў. Усё гэта дапаможа ў прасоўванні акаўнтаў рэгіянальных медыя.

«Жаданне ў маладых журналістаў ёсць, — канстатаваў міністр інфармацыі. — Яны жывуць у сацсетках, магчыма, аднак, не да канца разумеюць алгарытмы стварэння і прасоўвання кантэнту. Мы вучым іх гэтаму. Мы запрашаем на навучальныя семінары і блогераў-мільёнікаў, якія практычным шляхам намацалі гэтую нітку поспеху, каб яны падзяліліся сваімі напрацоўкамі. Гэта ўсё робіцца для прасоўвання нашага сумленнага, праўдзівага кантэнту, у тым ліку і ў новых лічбавых медыя».

У завяршэнні X Форуму маладых журналістаў адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў II Рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код».

Паводле БелТА.

Ёсць праблема!

КАЛІ МАЎЧАННЕ — НЕ ЗОЛАТА

Як абараніць сваіх дзяцей ад педафілаў і што рабіць, калі злачынства адбылося?

Сучасныя рэаліі паказваюць, што педафіл — гэта персанаж не дэтэктыўнага фільма, а хутчэй крымінальнай хронікі. Гэтыя адназначна хворыя людзі так, як і мы, ездзяць у грамадскім транспарце, стаяць у чарзе ў краме, весяляцца з сябрамі ў кафэ. Адрозніць іх ад маральна здаровых грамадзян практычна немагчыма. Чаго не скажаш пра дзяцей, якія падвергліся сексуальнаму гвалту: глыбокая маральная траўма застаецца ў іх на ўсё жыццё.

Як абараніць сваіх дзяцей ад падобнай трагедыі, чаму нельга маўчаць ахвярам педафілаў і што прадпрымаюць органы ўнутраных спраў, каб мінімізаваць злачынствы супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх, расказаў **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый УСАРАЎ.**

— Дзмітрый Сяргеевіч, завяршыліся комплексныя мерапрыемствы МУС, накіраваныя на супрацьдзеянне злачынствам супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх. Ці ўсіх пастаўленых задач удалося дасягнуць?

— Пачнём з таго, што комплекс не першы. Старт быў дадзены ў 2021 годзе. За гэты перыяд было праведзена пяць комплексных мерапрыемстваў. Якія ставіліся задачы цяпер? Перш за ўсё, зніжэнне латэнтнасці гэтага віду злачыннасці. Гэта галоўная праблема: калі пацярпелы, асабліва калі злачынства здзейснена ў сям'і, не заяўляе аб супрацьпраўным дзеянні. Удалося дасягнуць і другой, не менш важнай задачы, — сфарміраваць у грамадстве негатыўныя адносіны да праблематыкі, усведамленне таго, што яна існуе ў рэальнасці, а не на экране тэлевізара. Хочацца верыць, што людзі не будуць абыякавымі да праблемы, а стануць дапамагаць міліцыі змагацца з гэтым злом. Па-трэцяе, актывізавалася работа іншых суб'ектаў прафілактыкі. З-за таго, што ахвяры не паведамляюць аб факце педафіліі ў адносінах да іх, відавочна, што намаганняў адной міліцыі недастаткова. Патрэбна дапамога прадстаўнікоў адукацыі, урачоў, супрацоўнікаў культуры і спорту, псіхолагаў і іншых. Акрамя таго, мы дасягнулі прафілактычнага эфекту, аб чым сведчаць грамадскі водгук і зваротная сувязь. Падчас акцыі выявілі і шэраг злачынстваў, у тым ліку высокалатэнтных.

— А калі браць сітуацыю ў цэлым, колькі злачынстваў, звязаных з педафіліяй, устаноўлена за мінулы перыяд бягучага года?

— Мы назіраем рост колькасці зарэгістраваных супрацьпраўных дзеянняў. Выросла і колькасць асоб, якія здзейснілі гэтыя злачынствы. За 11 месяцаў гэтага года па ўсёй краіне ўстаноўлены 1082 злачынствы, звязаныя з педафіліяй. За аналагічны перыяд мінулага года было зафіксавана 1010 такіх фактаў. Аднак трэба разумець, што адна асоба можа здзейсніць не адно злачынства, а дзясятак і нават больш. Таму мы, ацэньваючы аператыўную абстаноўку, засяроджваем увагу не на колькасці фактаў, а на колькасці злачынцаў, якіх мы выявілі і затрымалі. Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх за 11 месяцаў бягучага года затрыманы 365 чалавек (351 чалавек за аналагічны перыяд мінулага года). І, нарэшце, пацярпелыя, бо ўся гэтая работа накіравана перш за ўсё на абарону дзяцей. Іх колькасць пакуль не дае нагоды заспакойвацца: за 11 месяцаў гэтага года ахвярамі педафілаў сталі 1117 непаўналетніх (за аналагічны перыяд мінулага года — 803).

— Складваецца ўражанне, што пік злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх назіраецца ў цяперашні час. Чаму такіх злачынстваў стала так шмат? Ці раней грамадства не было настолькі інфармавана?

— Гэта не пік. Такая загана, як педафілія, пастаянна існавала ў грамадстве. Сітуацыя кантралюецца. У многім гэты рост — вынік актывізаванай работы органаў унутраных спраў. Міліцыя прымяняе новыя формы і метады, у тым ліку ў сетцы інтэрнэт, дзе з кожным годам усё больш выяўляецца такіх злачынстваў. Адносіны з дзецьмі педафілы часцей перамяшчаюць у віртуальную прастору, дзе непаўналетнія ў меншай ступені знаходзяцца пад кантролем дарослых. Гэтым педафілы і карыстаюцца. Першыя зносіны ахвяры і педафіла пачынаюцца менавіта ў інтэрнэце. Прыкладна ў 40 % выпадках менавіта там і здзяйсняюцца злачынствы. Узмацняем узаемадзеянне з установамі адукацыі. Шэраг рэзанансных злачынстваў выяўлены сумесна з педагогамі, псіхолагамі, якія, звярнуўшы ўвагу на нетыповыя паводзіны дзіцяці або пасля правядзення псіхалагічнай дыягностыкі, выявілі, што ў адносінах да непаўналетняга можа здзяйсняцца сексуальны гвалт. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў праводзяць праверачныя мерапрыемствы і ўстанаўліваюць, што гэта сапраўды так. Акрамя таго, дае плён узаемадзеянне з медыкамі, якія дапамагаюць нам выяўляць гэтыя злачынствы. Яны звяртаюць увагу на прыкметы гвалту ў непаўналетніх пацыентаў, інфармуюць міліцыю, якая без лішняга шуму праводзіць пэўныя мерапрыемствы. Удасканальваецца і аператыўная работа міліцыі. Усё гэта ў сукупнасці дазваляе выяўляць больш фактаў супраць палавой недатыкальнасці. Чым больш працуем у гэтым кірунку, тым больш пераконваемся, што праблема па-ранейшаму існуе і ёй трэба актыўней займацца.

— А ці звяртаюцца ў міліцыю самі ахвяры педафілаў? Магчыма, аб злачынных дзеяннях паведамляюць бацькі або іншыя сваякі пацярпелых?

— Сітуацыя жадае лепшага. Істотная частка злачынных фактаў выяўляецца не па ініцыятыве ахвяр і іх блізкіх, а іншымі спосабамі. Часам нам дапамагаюць староннія людзі. Прыкладам таму з'яўляецца нядаўні выпадак, калі мужчына, які ехаў у тралейбусе ў Мінску, звярнуў увагу на дарослага мужчыну, які зайшоў з хлопчыкам, і неадэкватна сябе паводзіў. Аднак гэта адзінкавыя выпадкі. Мы прызнаём, што грамадства ў пэўнай меры інфармуе органы ўнутраных спраў, але ў той жа час канстатуем, што актыўнасць людзей не такая высокая, як хацелася б. Нярэдка пацярпелы бок звяртаецца ў міліцыю ўжо тады, калі ведае, што праваахоўныя органы ў курсе гэтай сітуацыі.

— Што прымушае непаўналетніх пацярпелых маўчаць?

— Па-першае, дзіця ў сілу ўзросту можа не разумець, што ў адносінах да яго здзяйсняецца злачынства. Па-другое, нават калі яно ўсведамляе, што адбываецца, то можа не паведамляць аб гэтым сваім сваякам па розных прычынах: баіцца, саромеецца. Акрамя таго, пацярпелы можа быць падвергнуты псіхалагічнаму ціску з боку педафіла. Для таго каб ахвяра маўчала, злачынцы ідуць на розныя хітрыкі: напрыклад шантаж. Могуць зрабіць і так, што дзіця будзе думаць, што калі ўсё гэта выявіцца, дарослыя яго зробяць вінаватым. Педафілы — тонкія маніпулятары. Калі размова ідзе аб педафіліі з боку бацькоў або блізкіх сваякоў, то тут усё складаней. Мы часта назіраем сітуацыі, калі маці дзіцяці ў курсе або здагадваецца, што бацька або айчым, сужыцель здзяйсняе злачынства, але або абыякава адносіцца да гэтага, або не верыць свайму дзіцяці, калі яно аб гэтым кажа. Бывае і такое, што блізкія людзі пацярпелага непаўналетняга займаюць бок злачынцы, думаючы, што гэтая праблема сама па сабе разыдзецца. Аргументуюць гэта тым, што важней за ўсё — захаваць сям'ю. Гэта ў корані няправільная пазіцыя. Яна прыводзіць да таго, што такія злачынствы могуць здзяйсняцца гадамі. У нашай практыцы здаралася, што і на працягу дзесяці гадоў дзіця падвяргалася сексуальнаму гвалту, пакуль не вырасла, не ўсвядоміла і не пазбавілася ад псіхалагічнай залежнасці, расказаўшы камусьці аб праблеме.

— Як распазнаць злачынцу?

— Педафіла не пазнаеш на вуліцы. Ім можа быць і асацыяльная асоба, якая злоўжывае спіртным, нідзе не працуе. А можа быць і сямейны чалавек з добрым заробкам. Педафілы — заўсёды мужчыны. Жанчыны, калі і здзяйсняюць такія злачынствы, то, як правіла, гэта звязана з аказаннем садзейнічання, стварэння ўмоў злачынцу для таго, каб ён здзейсніў сексуальны гвалт у адносінах да ахвяры. Што датычыцца ўзросту, сярод педафілаў ёсць людзі і 20-25 гадоў, і пенсіённага ўзросту. Часцей за ўсё мы ўстанаўліваем і затрымліваем мужчын ад 30 да 40 гадоў. Што датычыцца псіхалагічнага партрэта злачынцы, тут усё складаней. Некаторыя педафілы самі ў дзяцінстве падвяргаліся сексуальнаму або іншаму гвалту. І ўжо ў дарослым узросце ў іх з'яўляецца жаданне паспрабаваць сябе з іншага боку — не ў ролі ахвяры, а ў ролі злачынцы. Затрымліваючы педафілаў, звычайна выяўляем у іх дзіцячую парнаграфію, часта ў вялікай колькасці. Многія сексуальныя злачынцы з'яўляюцца актыўнымі спажыўцамі дзіцячага порна — гэта яшчэ адзін штрых да іх партрэта. Некаторыя так і кажуць, што інтарэс да дзяцей пачаўся менавіта з прагляду такой прадукцыі.

— У першым чытанні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі новаўвядзенні, якія датычацца змянення кодэксаў па пытанні прафілактыкі злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці і палавой свабоды ў адносінах непаўналетніх. Сярод прапаноў Міністэрства ўнутраных спраў — увесці адказнасць за прагляд парнаграфічных матэрыялаў з удзелам непаўналетніх...

— Ідзе размова аб адказнасці не толькі за выраб і распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі, як гэта адбываецца цяпер, але і за яе спажыванне. Што такое дзіцячая парнаграфія? Забаронены да абароту кантэнт, дзе зафіксавана цяжкае або асабліва цяжкае злачынства ў адносінах да дзіцяці. На каго накіравана стварэнне дзіцячай парнаграфіі? На спажыўца. Дзеля яго дзеці вярбуюцца, падвяргаюцца сексуальнаму гвалту. Таму мы прыходзім да высновы, што спажывец дзіцячай парнаграфіі — такі ж саўдзельнік злачыннага ланцужка, як стваральнік і распаўсюджвальнік. З псіхалагічнага пункту гледжання прагляд дзіцячай парнаграфіі спараджае жаданне паспрабаваць убачанае на экране ў рэальным жыцці. Таму, уводзячы адказнасць за захоўванне дзіцячай парнаграфіі, любыя дзеянні з ёй, мы караем усіх удзельнікаў абароту дзіцячай парнаграфіі. Акрамя таго, гэта дазволіць нам папярэдзваць сексуальныя злачынствы ў адносінах да дзіцяці. Калі мы прыцягваем да адказнасці асобу, якая ўжо спажывае дзіцячае порна, павышаем шанцы таго, што чалавек у будучыні да рэальнага непаўналетняга не дойдзе. І сёння ў міліцыі шмат інструментаў выяўляць такіх асоб. Пытанне ў тым, каб можна было прымяняць гэтыя інструменты на заканадаўчым узроўні.

— На што звярнуць увагу бацькам, каб гэтая бяда не прыйшла ў іх сям'ю?

— Кожны дарослы ў стане забяспечыць прафілактыку гэтага віду злачыннасці са сваімі дзецьмі. Па-першае, з маленькага ўзросту даступнай мовай трэба прывіваць ім, што правільна, а што не, у тым ліку ў частцы сексуальных паводзін, адносін з дарослымі. Дзіця павінна разумець, што нельга пагаджацца на прапановы незнаёмых людзей кудысьці з імі пайсці, нават размаўляць, калі ў гэтым няма неабходнасці. Бацькі не павінны прытрымлівацца трэндаў і ўстанаўліваць на мабільны тэлефон невялікаму дзіцяці кучу сучасных дадаткаў. Лепш, калі дзеці развіваюцца ва ўмовах жывога выхавання. Дзіця, якое яшчэ не ўсведамляе небяспекі, аказваецца ў віртуальнай прасторы і нярэдка становіцца ахвярай злачынства. Каб папярэдзіць гэта, устанавіце яму на мабільны тэлефон бацькоўскі кантроль. Акрамя таго, звярнайце ўвагу на паводзіны сваіх нашчадкаў, кола іх зносін, фізічны і маральны стан. Ніколі не пакідайце без увагі найменшыя змяненні. Бацькі павінны пагаварыць з дзіцем і паспрабаваць высветліць іх прычыны. Для гэтага трэба ўстанаўліваць даверлівыя адносіны ў сям'і. Дзіця павінна хацець расказаць аб сваёй праблеме бацькам, разумеючы, што не будзе за гэта пакарана і што не застанецца без дапамогі. Навучыце, калі гэта трэба, клікаць на дапамогу. Раскажыце, што аб тым, што выклікае падазрэнне, можна паведаміць любому даросламу, якому давяраеш: міліцыянеру, настаўніку, урачу. З дзіцем-падлеткам на гэтыя тэмы трэба размаўляць ужо больш прадметна: расказваць у даступнай форме, што такое сексуальныя адносіны і педафілія. Прывівайце асцярожнасць у інтэрнэце ў плане зносін з незнаёмцамі, дэманстрацыі сваіх фотаздымкаў, асабістых даных. Усё гэта педафілы выкарыстоўваюць для шантажу. Па вялікім рахунку, пры нармальнай прафілактычнай рабоце бацькоў не стаць ахвярай педафіла вельмі проста.

— Што рабіць, калі злачынства ўжо адбылося?

— Калі факт педафіліі адбыўся, не трэба думаць, што гэту праблему можна вырашыць уласнымі сіламі. Калі дзіця падверглася гвалту або з боку жывога чалавека, або ў інтэрнэце, гэта ў любым выпадку пакіне на ім след. Калі не паведаміць аб злачынцы ў міліцыю, то ён далей працягне дзейнічаць і ахвяр стане больш. Таму, калі гэта адбылося, першае правіла — інфармаваць органы ўнутраных спраў. Акрамя тэлефона 102, існуюць іншыя формы зваротнай сувязі. У шэрагу тэрытарыяльных органаў унутраных спраў створаны тэлеграм-каналы, дзе працуюць чат-боты, куды можна імгненна паведаміць аб праблеме. Ёсць тэлефоны гарачых ліній, даступных у інтэрнэце, формы зваротнай

сувязі на спецыялізаваных сайтах. Вельмі важны момант: у тым, што адбылося, не трэба абвінавачваць дзіця. Гэта дапаможа знізіць псіхалагічную траўму. Бацькі павінны ведаць, што ў краіне існуе нацыянальны механізм аказання дапамогі ахвярам педафіліі.

— У якіх сем'ях часцей за ўсё выяўляюцца ахвяры педафілаў?

— Ахвярамі злачынцаў становяцца як дзеці, што выхоўваюцца ў сем'ях, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, так і дзеці са шчаслівых і паспяховых сем'яў. Першыя падвяргаюцца сексуальнаму гвалту не толькі з боку сваякоў. За імі ніхто не глядзіць, яны часта сыходзяць з дому, наведваюць усялякія флэты, знаёмяцца ў інтэрнэце з дарослымі людзьмі — у выніку здзяйсняюцца злачынствы. Такія сем'і знаходзяцца ў полі зроку міліцыі. Мы праводзім пэўныя мерапрыемствы, якія дазваляюць не дапусціць такога роду злачынства, звесці да мінімуму рызыку педафіліі ў адносінах да дзіцяці. У жыцці такіх сем'яў пастаянна ўдзельнічаюць і прадстаўнікі адукацыі. У чым прычына, што ахвярамі злачынцаў становяцца дзеці з добрых сем'яў? Нярэдка спрацоўвае фактар залішняй ранняй самастойнасці. Бацькі не звяртаюць увагу на змяненні ў паводзінах свайго дзіцяці з-за сваёй занятасці, адсутнасці даверлівых адносін.

— Ці ўсе з педафілаў з'яўляюцца хворымі людзьмі і якая адказнасць прадугледжана за злачынства супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх?

— Пад педафіламі ў паўсядзённым ужытку часта маем на ўвазе ўсіх, хто здзяйсняе злачынствы супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх. Крымінальным кодэксам прадугледжана цэлых пяць саставаў. Але з медыцынскага пункту гледжання педафіл — гэта чалавек, які мае псіхічныя адхіленні. Як паказвае статыстыка, такіх людзей не больш чым 5 % ад тых, хто прыцягнуты да адказнасці. Ва ўсіх астатніх такі дыягназ не канстатуецца. Так, у іх ёсць адхіленне сексуальных паводзін, але яны не псіхічна хворыя. Яны ўсведамляюць, што робяць і разумеюць, што за гэта будзе пакаранне. Калі чалавек не ўсведамляе сваіх дзеянняў, то ў адносінах да яго суд можа прымяніць прымусовыя меры бяспекі — лячэнне. Людзі, у каго такіх паталогій няма, нясуць крымінальную адказнасць. На цяперашні момант яна складае да 15 гадоў пазбаўлення волі ў залежнасці ад ступені цяжкасці злачынства. Пры гэтым за некаторыя сексуальныя дзеянні ў адносінах да дзяцей адказнасць наступае не з 18, а з 14 гадоў. Пасля адбыцця пакарання такі грамадзянін застаецца пад прафілактычным кантролем міліцыі. Ён ажыццяўляецца для таго, каб звесці да мінімуму рызыку рэцыдыву здзяйснення злачынства. На шчасце, гэта адзінкавыя выпадкі.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МУС.

Баявая падрыхтоўка

«Гатоўнасць да самаахвяравання — ужо подзвіг!»

Іван КУБРАКОЎ наведаў атрад спецыяльнага прызначэння «Тарнада»

Падраздзяленне створана на базе вайсковай часці 3310. Задачы, ускладзеныя на байцоў атрада, — барацьба з дыверсійна-разведвальнымі групамі і незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі.

Міністр унутраных спраў азнаёміўся з экіпіроўкай, тэхнікай і ўзбраеннем новага падраздзялення. Пры адпрацоўцы розных уступных вайскоўцы прадэманстравалі свае навыкі і ўменні.

Рашэнне аб стварэнні ва ўсіх рэгіёнах спецыяльных падраздзяленняў, гатовых гарантаваць бяспеку нашых грамадзян у любых умовах і ў любым пункце краіны, было прынята кіраўніком міліцэйскага ведамства паўтара года таму.

— Дзякую, што прынялі рашэнне служыць у такім падраздзяленні, — звярнуўся Іван Кубракоў да асабовага складу. — Вы — сапраўдныя патрыёты сваёй краіны! Упэўнены, кожны з вас, калі спатрэбіцца, неадкладна прыйдзе на дапамогу людзям і стане на іх абарону. Нават коштам свайго жыцця. А гатоўнасць да самаахвяравання — гэта ўжо подзвіг! Жадаю вам моцнага здароўя, удачы і ўсяго найлепшага, а атраду — даўгалецця і росквіту.

Міністр нацэліў камандзіраў і байцоў на працяг планамернай працы па павышэнні ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі. Тым, хто найбольш вызначыўся, уручыў заслужаныя ўзнагароды.

У сваю чаргу, **намеснік міністра — камандуючы ўнутранымі войскамі Мікалай КАРПЯНКОЎ** уручыў кіраўніку ведамства крапавы берэт, які з'яўляецца сімвалам мужнасці, доблесці і адвагі. «Задачы, якія мне даводзілася выконваць усе гэтыя гады, рэалізоўваліся сумесна з унутранымі войскамі, — заўважыў Іван Кубракоў. — Ды і пачынаў я менавіта там. Хачу запэўніць: я з вамі заўсёды ў адным страі. Перакананы, у нас усё атрымаецца!»

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МУС.

Асцярожна — махляры!

КУПЛЯЮЧЫ, НЕ ЗГУБІЦЕ

Як напярэдадні навагодніх свят не трапіць на хітрыкі інтэрнэт-ашуканцаў?

Людзі настолькі прызвычаіліся ажыццяўляць пакупкі праз інтэрнэт, што не лічаць патрэбным хадзіць у звычайныя крамы. Апранаюцца ў адзенне, якое прыгледзелі ў віртуальнай прасторы, набываюць там сродкі гігіены, посуд, падарункі, і нават прадукты замаўляюць у інтэрнэце. Вядома, гэта зручна: не трэба марнаваць час на паходы па гандлёвых цэнтрах і крамах. Прычым нярэдка набыты тавар табе даставяць да самых дзвярэй. Аднак, як паказвае жыццё, не ўсе пакупкі трапляюць да адрасата...

Вярнуць грошы практычна немагчыма

Апошнім часам выпадкі махлярства пачасціліся ў сацыяльнай сетцы Instagram. За дзесяць месяцаў бягучага года на гэтай платформе зафіксавана звыш 2800 злачынстваў.

Як гэта працуе? Інтэрнэт-карыстальнікі заходзяць на канкрэтны акаўнт, які ажыццяўляе продаж тых ці іншых тавараў. Гартаюць стужку, выбіраюць патрэбную рэч і замаўляюць яе ў прадаўца. Апошні ўступае з пакупніком у перапіску, у ходзе якой прапануўвае перавесці перадаплату за тавар, які карыстальнік сацсеткі плануе набыць. Чалавек пагаджаецца і чакае, пакуль аплачаная пакупка прыйдзе яму па пошце, як паабяцаў прадавец. У выніку пасылка да адрасата не даходзіць: як высвятляецца, яе нават не адпраўлялі. Ды і грошы, пераведзеныя прадаўцу за тавар, вяртаць ніхто не збіраецца. Пасля таго як махляры атрымалі кругленькую суму, на сувязь з пацярпелым яны не выходзяць.

Падманутыя грамадзяне звяртаюцца ў міліцыю, аднак разлічваць на тое, што супрацоўнікі органаў унутраных спраў дапамогуць вярнуць страчаныя грошы, асабліва не варта.

— Калі махляры знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, карыстаюцца банкаўскімі картамі і рахункамі банкаўскіх устаноў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у нашай краіне, то ўстанавіць зламысніка не складае цяжкасцяў, — тлумачыць **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі МУС палкоўнік міліцыі Васіль ШУПЛЯК.** — Калі яго віна ў здзяйсненні злачынства будзе даказана, то махляр абавязваецца выплачваць пацярпеламу нанесеную матэрыяльную шкоду. Калі ж грошы трапляюць на рахункі замежных банкаў (гэта азначае, што злачынцы дзейнічаюць з-за мяжы), вярнуць іх практычна немагчыма. І трэба, каб нашы грамадзяне, якія ажыццяўляюць інтэрнэт-пакупкі, гэта ўсведамлялі.

Па словах начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі МУС, большасць людзей, якія трапляюць у злачынныя сеткі інтэрнэт-махляроў, задумваюцца аб прычыне нізкай цаны. Некаторых насцярожваюць іншыя дэталі ажыццяўлення пакупкі. Аднак у выніку псіхалагічных маніпуляцый, якія выкарыстоўваюць махляры, чалавек плаціць за тое, чаго ніколі не атрымае.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375333031971, Ермошкевич Евгений Васильевич** – лот № 1; **+375292751275, Виноградов Дмитрий Алексеевич (понедельник–пятница с 9.00 до 17.00)** – лот № 2.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Информация о продавце	**ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

КОСМАС — ЛАКАМАТЫЎ ДЛЯ СТВАРЭННЯ НОВЫХ

ПРЫЯРЫТЭТНАЯ СФЕРА ІНАВАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ

— Ці можна сёння з упэўненасцю казаць аб стварэнні ў нашай краіне касмічнай галіны? Што дае нам права лічыць сябе касмічнай дзяржавай? Патлумачце, калі ласка, як рэалізацыя касмічных праграм уплывае на беларускую эканоміку?

Пётр ВІЦЯЗЬ: У Беларусі заўсёды былі моцныя навуковыя школы фізікі, матэматыкі, інфарматыкі і матэрыялазнаўства. Пытаннямі, так ці інакш звязанымі з космасам, займалася мноства арганізацый у складзе як Акадэміі навук БССР, так і навуковых цэнтраў ВНУ. Беларускія фізікі першымі пачалі даследаванні ўздзеяння плазменных і радыяцыйных патокаў на цеплаахоўныя пакрыцці касмічных апаратаў і мадэляванне ўваходжання аб'ектаў у шчыльныя слаі атмасферы. Ужо на першых савецкіх штучных спадарожніках стаяла ўнікальнае абсталяванне, створанае ў Беларусі.

Сёння на Нацыянальную акадэмію навук Беларусі ўскладзена правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі, рэгуляванне дзейнасці ў галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Для рэалізацыі гэтых і іншых задач у касмічнай сферы ў НАН Беларусі ў 2015 годзе было створана і паспяхова функцыянуе Агенцтва па касмічных даследаваннях.

У 2003 годзе Прэзідэнт прыняў рашэнне аб стварэнні Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. У 2007-м была сфарміравана ўласная беларуская касмічная праграма. У 2012 годзе з запускам спадарожніка БКА (дарэчы, мы адзіныя з краін постсавецкай прасторы, не лічачы Расіі, хто мае апарат уласнай распрацоўкі) Беларусь увайшла ў лік касмічных дзяржаў, а ў снежні 2013-га стала паўнапраўным членам Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах.

У 2016-м выводзіцца на арбіту беларускі тэлекамунікацыйны спадарожнік сувязі «Белінтэрсат-1», разлічаны на перадачу радыё- і тэлесігналаў, а таксама забеспячэнне доступу ў інтэрнэт. У 2018 годзе Беларусь прымала XXXI Міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў — нашу краіну наведалі больш як 80 чалавек, якія пабывалі ў космасе. У тым жа годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт вывеў на арбіту свой першы адукацыйны нанаспадарожнік BSUSat-1. А летась у космас адправіўся ўжо другі адукацыйны нанаспадарожнік БДУ.

Летась у Акадэміі навук прайшоў ужо VIII Беларускі касмічны кангрэс.Таму сёння можна з упэўненасцю казаць аб стварэнні ў нашай краіне касмічнай галіны, у якой задзейнічана больш як 20 навуковых і вытворчых арганізацый, працуюць каля чатырох тысяч кваліфікаваных спецыялістаў, сфарміравана інфраструктура, мэта якой — стратэгічныя даследаванні.

Касмічная сфера вызначана як адна з прыярытэтных сфер інавацыйнага развіцця Беларусі. У ліку перспектыўных кірункаў — рэалізацыя нацыянальнай касмічнай праграмы на 2021—2025 гады, развіццё сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, прымяненне вынікаў касмічнай дзейнасці ў інтарэсах розных сфер, уключаючы дакладнае земляробства, лічбавізацыю, вывучэнне Антарктыкі. Сярод актуальных кірункаў таксама развіццё нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання, навігацыйнай, геадэзічнай і картаграфічнай дзейнасці на аснове касмічных тэхналогій, сістэмы аэракасмічнай адукацыі, распрацоўка новых матэрыялаў, якія прымяняюцца пры стварэнні касмічных апаратаў для даследавання блізкага і далёкага космасу, удзел у міжнародных праектах па вывучэнні Месяца, Марса і іншых аб'ектаў далёкага космасу.

Створаная год таму карпарацыя «Белкосмас» — гэта не юрыдычнае аб'яднанне, а кластарная структура, мэта якой — каардынаваць дзейнасць у касмічнай сферы ў агульных інтарэсах, каб павысіць эфектыўнасць аказання паслуг. Ад Акадэміі навук у склад навуковага кластара ўвайшлі Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі, УП «Геаінфармацыйныя сістэмы», НПЦ шматфункцыянальных беспілотных комплексаў НАН Беларусі, а таксама арганізацыі, з якімі Акадэмія навук супрацоўнічае. Гэта Кітайска-Беларускае сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы», таварыства з абмежаванай адказнасцю «КБ Беспілотныя верталёты». Галаўной арганізацыяй кластара з'яўляецца Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сяргей ЧЫЖЫК: «Міжнародная навуковая месяцавая станцыя — грандыёзны праект, які адной краіне не па сілах...»

Пётр ВІЦЯЗЬ: «Навука павінна ствараць такія тэхналогіі, якія будуць сябе акупляць, спрашчаць і паляпшаць жыццё чалавека».

Іван БУЧА: «Удзел у даследаванні космасу могуць дазволіць сабе толькі высокатэхналагічныя краіны».

Такі састаў удзельнікаў прадыктаваны іх кампетэнцыямі ў вырашэнні найважнейшых задач карпарацыі, сярод якіх выпрацоўка палітыкі і стратэгіі развіцця Рэспублікі Беларусь у касмічнай сферы, распрацоўка прапаноў па фарміраванні праграм у рамках Саюзнай дзяржавы, СНД і ЕАЭС, дзяржаўных праграм і праектаў у касмічнай сферы, правядзенне навуковых даследаванняў, распрацоўка новай канкурэнтаздольнай аэракасмічнай тэхнікі...

На бліжэйшым навуковым Савеце карпарацыі «Белкосмаса» мы будзем разглядаць магчымасць уключыць іншыя арганізацыі ў дзейнасць карпарацыі, якія хочуць сумесна працаваць па выкарыстанні касмічных тэхналогій.

Уплыў касмічнай галіны на эканоміку шматвектарны. Ён уключае і іміджавы складнік, бо ўваходжанне Беларусі ў клуб касмічных дзяржаў самым непасрэдным чынам сведчыць аб высокатэхналагічным патэнцыяле нашай навукі і прамысловасці. Асабліва ў эканамічным плане: даныя, атрыманыя сістэмай дыстанцыйнага зандзіравання, дазваляюць адсочваць стан пасеваў, лясных масіваў, воднай сістэмы, розных аб'ектаў (дарог, трубаправодаў, збудаванняў), выяўляць цеплавыя анамаліі, рабіць прагноз надвор'я і ўраджайнасці збожжавых культур, адсочваць тэхнагенныя і прыродныя надзвычайныя сітуацыі, ствараць і абнаўляць тапаграфічныя і навігацыйныя карты, выяўляць перспектыўныя плыцоўкі для распрацоўкі карысных выкапняў. За час работы на арбіце спадарожнік акупіў сябе неаднаразова. Галоўнымі заказчыкамі здымкаў, якія робіць спадарожнік, з'яўляюцца МНС, Дзяржаўны камітэт па маёмасці, Белгідрамет, Мінпрыроды, Мінлясгас, Мінсельгасхарч, Мінбудархітэктуры, Следчы камітэт і іншыя структуры і ведамствы.

Можна прыгадаць выпадак з вялікім пажарам у Чарнобыльскай зоне ў 2019 годзе. МНС Беларусі за два тыдні да таго, як пажар наблізіўся да граніц краіны, ужо мела інфармацыю аб надзвычайнай сітуацыі. Былі праведзены адпаведныя работы, і пажар быў спынены практычна на мяжы.

Увогуле, адметнасць сучаснай навукі ў тым, што яе дасягненні прысутнічаюць паўсюдна, а мы гэтага ўжо не заўважаем. Просты прыклад: сістэма геалакацыі ў любым смартфоне або таксі таксама выкарыстоўвае даныя спадарожнікавай здымкі...

— Але патрабаванні карыстальнікаў да характарыстык касмічнай інфармацыі растуць, асабліва па раздзяляльнай здольнасці здымак. Ці ўлічваецца гэта інфармцыя пры стварэнні новага расійска-беларускага спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі? І ўвогуле, як развіваецца супрацоўніцтва ў касмічнай сферы ў рамках навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі?

Сяргей ЧЫЖЫК: Тэрыторыя павінна здымацца з раздзяляльнай здольнасцю 0,7-0,5 метра. Гэта сучасныя патрабаванні. Цяперашнія нашы магчымасці — 2 метры, а мы замахнуліся на 0,35 метра. Калі атрымаецца, то дэталізацыя здымкаў у параўнанні з цяперашнім узроўнем вырасце ў разы. Плюс робіцца стаўка на шматфункцыянальнасць. Калі будзе весціся здымка, пажадана, каб яна была спектральная. Калі мы будзем бачыць тэрыторыю ў розных аптычных спектрах, гэта дасць больш дакладную інфармацыю аб стане тэрыторыі, пасеваў, лясных масіваў, наступствах катастрафічных затапленняў. Мы рушым у бок шматузроўневых выяў. Касмічны апарат будзе пастаўляць вялікія даныя, таму спатрэбіцца прыцягненне суперкамп'ютарнай тэхнікі і спецыяльнага праграмнага забеспячэння, каб гэты масіў дадзеных прааналізаваць. Касмічная платформа ў новым спадарожніку будзе расійская, а аптычныя сістэмы — беларускія.

Працуюць у Беларусі і над другім беларускім спадарожнікам. Таксама ў Акадэміі навук пачынаюць распрацоўку тэхналогій запуску мікраспадарожнікаў — спадарожнікаў на невысокай арбіце для адпрацоўкі розных тэхналогій і маніторынгу, напрыклад, маніторынгу вакол атамнай станцыі.

ШМАТСПАДАРОЖНІКАВЫЯ ГРУПОЎКІ НА АРБІЦЕ

— А як развіваецца супрацоўніцтва ў касмічнай сферы ў рамках навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі? Ці адчуваецца ўплыў заходніх санкцый?

Пётр ВІЦЯЗЬ: Большасць беларускіх арганізацый, якія задзейнічаны ў рэалізацыі савецкіх касмічных праграм, працуюць і цяпер. У Беларусі выпускаецца высокадакладнае оптыка-электроннае абсталяванне, сучасная мікрапрацэсарная тэхніка, інтэгральныя мікрасхемы, выпрабавальнае абсталяванне і многае іншае. А ў беларускіх ВНУ рыхтуюць спецыялістаў для аэракасмічнай галіны.

У рамках Саюзнай дзяржавы рэалізавана ўжо восем праграм па касмічнай тэматыцы, вынікі якіх былі накіраваныя на пашырэнне агульнай навукова-тэхналагічнай і інфармацыйнай прасторы дзвюх краін, інтэграцыю інтэлектуальных і вытворчых рэсурсаў.

У рамках дзявятай сумеснай праграмы «Комплекс-СД» будуць створаны і выпрабаваны тэхналагічныя ўзоры касмічных апаратаў — малога касмічнага апарата вагой да 250 кілаграмаў, а таксама нанаспадарожнікаў — беларускага і расійскага. Запуск вялікіх апаратаў звязаны са значнымі эканамічнымі выдаткамі, таму няма магчымасці рабіць гэта часта і хутка. Апошнія сусветныя тэндэнцыі — выкарыстанне мікра- і нанаспадарожнікаў, запуск якіх можна ажыццявіць кластарным спосабам. Гэта значыць адна ракета запускае дзясяткі касмічных апаратаў, якія прадставяць сабой арбітальную групоўку. Праграма «Комплекс-СД» прызначана для стварэння навукова-тэхнічных задзелаў для вырашэння гэтых праблем. У яе ўваходзіць распрацоўка базавых элементаў арбітальных і наземных сродкаў у інтарэсах стварэння шматспадарожнікавых груповак малапамерных касмічных апаратаў, назіранне зямной паверхні і калязямной касмічнай прасторы.

У выніку рэалізацыі праграмы «Комплекс-СД» Беларусь і Расія атрымаюць арбітальную групоўку касмічных апаратаў Саюзнай дзяржавы, якія будуць працаваць ва ўзаемадзеянні паміж сабой і кіравацца з Зямлі. Цяперашняя праграма інтэгруе ў сабе тыя інтэлектуальныя, навуковыя і вытворчыя магчымасці, якімі валодаюць нашы дзяржавы.

Беларусь і Расія актывізавалі інтэграцыйныя працэсы на фоне ўвядзення заходніх санкцый, у тым ліку і ў касмічнай галіне. **Санкцыі сталі стымулам для паглыблення навукова-даследчых і канструктарскіх работ, аналізу нашага патэнцыялу для рэалізацыі агульных касмічных праграм Саюзнай дзяржавы.** У цэлым забяспечана незалежнасць і самадастатковасць Саюзнай дзяржавы ў галіне касмічных даследаванняў ва ўмовах санкцый Захаду. Гэта датычыцца дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, інфармацыйных касмічных тэхналогій, электроннай кампанентнай базы, матэрыялаў і тэхналогій іх апрацоўкі. На дадзены момант беларускія і расійскія вучоныя займаюцца распрацоўкай цэлай групоўкі апаратаў звышвысокай дакладнасці.

Дарэчы, першыя прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі былі ўручаны двум сумесным аўтарскім калектывам з Беларусі і Расіі менавіта па касмічнай тэматыцы.

НА МЕРКУРЫЙ — З БЕЛАРУСКІМІ ЭКРАНАМІ

— Развіццё касмічнай галіны немагчымае без стварэння новых матэрыялаў і прылад, якія здольныя вытрымліваць вельмі агрэсіўнае ўздзеянне касмічнай прасторы. Ці задзейнічаны распрацоўкі беларускіх вучоных у засваенні Далёкага космасу?

Пётр ВІЦЯЗЬ: Ключавыя моманты для космасу — гэта высокая трываласць і малая вага. Таму ўсе даследаванні нашых вучоных скіраваныя на тое, каб зменшыць вагу, але каб фізічная трываласць пры гэтым не пацярпела. Распрацоўваюцца лёгкія па ўдзельнай вазе, высокатрывалыя ці кампазіцыйныя матэрыялы. Перш за ўсё гэта тытанавыя сплавы, алюмініевыя, кампазіцыйныя палімерныя матэрыялы. Выпрабаваннямі новых матэрыялаў займаюцца многія акадэмічныя інстытуты. Галоўным па гэтым кірунку з'яўляецца Інстытут цепла- і масаабмену НАН Беларусі.

Не менш важная задача — абарона прыбораў ад касмічнай радыяцыі, а оптыкі — ад касмічнага смецця. У 2020 годзе завяршылася рэалізацыя саюзнай праграмы «Тэхналогія-СД», якая была накіравана на выкарыстанне, дапаўненне і развіццё ў ракетна-касмічнай галіне дасягненняў у сферы нанаматэрыялаў, нанапакрыццяў і наназлектронікі. У выніку сумеснай дзейнасці Беларусі і Расіі былі распрацаваны комплексныя тэхналогіі стварэння шырокай наменклатуры прылад і сістэм ракетна-касмічнай тэхнікі з забеспячэннем зніжэння іх масы і габарытаў пры павышэнні тэхнічных і эксплуатацыйных характарыстык, у тым ліку ўніверсальных касмічных платформ, сістэм тэрмарэгулявання і электрасілкавання, нанаэлектронных прылад, функцыянальных нанаструктурных сэнсараў рознага прызначэння, нанаўладкавання розных сістэм касмічных апаратаў з павышаным рэсурсам эксплуатацыі.

Сяргей ЧЫЖЫК: Космас — гэта складанае і агрэсіўнае асяроддзе, дзе шмат дэстабілізуючых фактараў, якія негатыўна ўздзейнічаюць на работу ўсіх прыбораў і апаратуры. Для іх дакладнай, надзейнай і доўгачасовай работы патрабуюцца новыя тэхнічныя і тэхналагічныя рашэнні.

Электрамагнітная абарона патрабуецца ў першую чаргу для электронікі, таму што

МАТЭРЫЯЛАЎ, ТЭХНАЛОГІЙ І НОВЫХ РАШЭННЯЎ

ўздзеянне электрамагнітных палёў выводзіць яе са строю. Пяць гадоў таму Японія запусціла свой спадарожнік на Меркурый. На борце японскага касмічнага апарата MercuryMagnetosphericOrbiter, які ўдзельнічае ў даследчай місіі BepiColombo, устаноўлены шматслойныя электрамагнітныя экраны, створаныя спецыялістамі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве.

Па дадзенай праблематыцы навукоўцы Акадэміі навук актыўна працуюць з «Раскосмасам» — беларускія экраны ўсталёўваюцца на касмічных лятальных апаратах, абараняючы разнастайныя датчыкі і дэтэктары як ад знешніх, так і ад унутраных уздзеянняў. У НПЦ НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве распрацаваны новыя матэрыялы і тэхналагічныя працэсы фарміравання электрамагнітнай і радыяцыйнай абароны на карпусах прыбораў і элементаў шырокага спектра прызначэння.

Трэба разумець, што калі раней ахоўныя экраны для касмічных апаратаў па таўшчыні маглі складаць і некалькі сантыметраў, то зараз патрабаванні па масагабарытных параметрах сталі больш жорсткімі. Беларускія вучоныя распрацавалі электрамагнітную абарону для японскага спадарожніка таўшчынёй усяго 0,3 міліметра. Гэта надзвычай важна для палётаў у космас, дзе кожны грам нагрузкі каштуе вялікіх грошай. Спадарожнік ужо дасылае здымкі Меркурыя на Зямлю.

Нашы матэрыялы будуць задзейнічаны і на новых спадарожніках, якія ствараюцца ў рамках Саюзнай дзяржавы. У ствараемай арбітальнай групоўцы спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі аптычная карысная нагрузка будзе спраектавана, распрацавана і часткова выраблена ў Беларусі.

На расійскім сегменце Міжнароднай касмічнай станцыі ёсць прыборы спектральнага аналізу, распрацаваныя навукоўцамі Інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ. Відэаспектральная сістэма дазваляе разгледзець тое, што нябачна ні чалавечаму воку, ні звычайнай тэхніцы, малейшыя змяненні. Але далейшая тэматычная апрацоўка атрыманай інфармацыі адбываецца ўжо на Зямлі. Апаратура ўстаноўлена на ілюмінатары. Каб усё працавала аўтаматычна, быў распрацаваны комплекс САВА — сістэма арыентацыі відэаспектральнай апаратуры. Ставяцца вельмі складаныя задачы, якія раней не вырашаліся.

Трэба сказаць, што гэта магутны штуршок для развіцця навуковых даследаванняў. Калі мы кажам пра Савецкі Саюз, што згадваем у першую чаргу сярод навуковых дасягненняў? Космас і атамную энергетыку. Гэтыя два кірункі ўзнялі імідж краіны і прымусілі вучоных працаваць над шэрагам праектаў. Вось і сёння мы склалі магчымы план супрацоўніцтва па Міжнароднай навуковай месяцавай станцыі: туды ўвашлі прапановы нашых матэматыкаў, біёлагаў, спецыялістаў Інстытута цепла- і масаабмену па вывучэнні паводзін матэрыялаў.

Мы лічым, што на Месяцы могуць быць умовы для новых вытворчасцяў. Так, напрыклад, у бязважкасці ствараюцца вельмі добрыя ўмовы для вырошчвання крышталёў для электронікі. Пры адсутнасці гравітацыі зусім па-іншаму адбываецца фарміраванне крышталічных рэчываў. Такія грандыёзныя праекты, як навуковая месяцавая станцыя, ні Кітай, ні Расія, ні ЗША самастойна рэалізаваць не змогуць. Патрабуецца аб'яднанне намаганняў. І калі мы будзем удзельнічаць у гэтым праекце, для беларускай навукі гэта будзе вельмі ганарова. Але за сваё месца яшчэ трэба будзе пазмагацца...

НАШЫ ІНТАРЭСЫ НА МЕСЯЦЫ

— Нядаўна Акадэмія навук і Кітайская Нацыянальная Касмічная Адміністрацыя падпісалі Сумесную дэкларацыю аб супрацоўніцтве па Міжнароднай навуковай месяцавай станцыі. Праект даволі амбіцыйны. Якім вы бачыце ўклад у яго беларускіх спецыялістаў?

Сяргей ЧЫЖЫК: Кітайская Народная Рэспубліка з'яўляецца касмічнай дзяржавай. Яна ўвайшла ў гэты клуб вельмі ўпэўнена. Мы ўсе бачым іх вынікі. І вось Кітайская Нацыянальная Касмічная Адміністрацыя выйшла з ініцыятывай аб'яднаць намаганні шэрагу краін, якія жадаюць паўдзельнічаць у асваенні Месяца. Нам пакуль гэта задача бачыцца вельмі далёкай, амаль фантастычнай, але ў кітайскіх калег ёсць канкрэтны план. Да 2030 года на Месяц адправяцца тры месяцаходы для таго, каб вывучыць ценявы бок спадарожніка, яго глебу, узяць узоры грунту, правесці іх аналіз. А з 2030 года плануецца распачаць будаўніцтва станцыі непасрэдна на Месяцы.

Шэраг краін атрымалі прапанову далучыцца, у тым ліку і Беларусь. Мы падпісалі сумесную дэкларацыю па міжнароднай станцыі, але гэта не значыць, што беларусы паляцяць на Месяц. Пра гэта казаць пакуль рана. Ідзе размова пра тое, каб беларускія распрацоўкі былі выкарыстаны пры рэалізацыі грандыёзнага міжнароднага праекта. Мы можам, напрыклад, сумесна папрацаваць над крыніцамі энергіі на Месяцы, магчыма, гэта будуць малыя ядзерныя ўстаноўкі. Спатрэбяцца матэрыялы з радыяцыйнай устойлівасцю, аблегчаныя, але пры гэтым здольныя вытрымаць высокі каэфіцыент трэння, калі будзе пагроза высокага зносу. Мы падрыхтавалі пералік нашых прапаноў. Гэта могуць быць, напрыклад, станцыі па прыёме інфармацыі, цэнтры апрацоўкі даных, работа з вялікімі данымі, забеспячэнне жыццядзейнасці раслін на штучных грунтах, выкарыстанне святлодыёднай тэхнікі.

Фота БелТА.

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ і Анастасія ЛЯНКОВА ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў.

НІЯКІХ СКІДАК ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ...

— У сакавіку наступнага года на расійскі сегмент Міжнароднай касмічнай станцыі павінен адправіцца беларускі касманаўт. У якой стадыі знаходзіцца падрыхтоўка беларускіх дзяўчат? Ці сфарміраваная ўжо навуковая праграма іх палёту?

Іван БУЧА: 12 красавіка 2022 года ў Міжнародны дзень касманаўтыкі прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін у ходзе рабочай сустрэчы на касмадроме «Усходні» дамовіліся аб адпраўцы беларускага касманаўта на Міжнародную касмічную станцыю (МКС). Вырашылі, што палёт будзе кароткі — у рамках экспедыцыі наведвання МКС. Адразу скажу, што адбор кандыдатаў на касмічны палёт — складаная і спецыфічная задача, якую нам давялося выконваць упершыню. Таму мы вырашылі абапірацца на вопыт расійскай пілатуемай касманаўтыкі. Папярэдне былі вывучаны патрабаванні да прафесійных касманаўтаў, медыцынскія патрабаванні, вызначаны навуковыя задачы на палёт і на іх падставе распрацаваны патрабаванні да кандыдатаў.

Для іх быў вызначаны ўзроставы цэнз — ад 25 да 40 гадоў. Чаму ніжні парог складае 25 гадоў? Таму што, па меркаванні расійскай касмічнай медыцыны, гэта мінімальны ўзрост, які даваляе ўдзельнічаць у касмічным палёце. Да 25 гадоў арганізм яшчэ не сфарміраваны канчаткова і можа пацярпець пры сур'ёзных нагрузках. Далей былі патрабаванні да адукацыі прэтэндэнтаў, улічваючы навуковую праграму з эксперыментамі, якія давядзецца выконваць на МКС. Абавязковай была наяўнасць вышэйшай адукацыі.

У сувязі з тым, што на касмічнай станцыі нашаму касманаўту давядзецца кантактаваць з прадстаўнікамі розных краін (а там заразакрамя расійскіх каманаўтаў знаходзяцца грамадзяне ЗША, Японіі, Данніі), патрабуецца веданне англійскай мовы ў аб'ёме, дастатковым для стасункаў. Што датычыцца медыцынскіх патрабаванняў, кандыдатам трэба было прайсці прыкладна 25 даследаванняў, вынікі якіх разглядаліся спачатку ў нас, а потым адпраўляліся ў Цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў у Расію. Так былі адабраныя шэсць кандыдатаў, якія ў снежні мінулага года прайшлі вочнае медыцынскае даследаванне ўжо ў Зорным гарадку на прадмет магчымасці допуску да падрыхтоўкі да палёту. З гэтых шасці прэтэндэнтаў былі адабраныя двое — асноўны кандыдат і дублёр. Здароўе было адным з асноўных крытэрыяў, таму што нават нягледзячы на тое, што касмічныя палеты сталі больш бяспечнымі і «камфортнымі», з космасу павінен вярнуцца здаровы чалавек. Нагрузкі там усё ж каласальныя...

У асноўны экіпаж экспедыцыі на МКС увайшла бортправадніца «Белавія» Марына Васілеўская, астранаўт NASA Трэйсі Дайсан, а камандаваць экіпажам прызначаны расійскі лётчык-касманаўт, Герой Расіі Алег Навіцкі, які таксама нарадзіўся і вырас у Беларусі. Іх дублёрамі сталі Анастасія Лянкова — урач РНПЦ дзіцячай хірургіі, астранаўт NASA Дональд Пеціт і касманаўт «Раскосмасу», Герой Расіі Іван Вагнер (камандзір дубліруючага экіпажа).

Падрыхтоўка беларускіх дзяўчат да касмічнага палёту распачалася напрыканцы ліпеня ў Зорным гарадку. Гэта дастаткова складаная і насычаная мерапрыемства. Для абодвух экіпажаў распрацаваная праграма навучання касманаўтаў тым дзеянням, якія яны павінны будуць выконваць у касмічным палёце і пры знаходжанні на МКС. Падчас палёту на нашых кандыдатаў ускладаецца шэраг абавязкаў па забеспячэнні ўласнай жыццядзейнасці ў касмічным караблі і выкананне даручэнняў камандзіра па забеспячэнні жыццядзейнасці ўсяго касмічнага карабля і экіпажа падчас палёту да МКС і пры вяртанні на Зямлю. На касмічнай станцыі — правядзенне даследаванняў, а таксама ўдзел у забеспячэнні жыццядзейнасці ўсяго расійскага сегмента МКС. Космас, як і іншыя тэхнічна складаныя сферы, не застрахаваны ад чалавечага фактару. Аднак магчымасці для выпраўлення памылак у космасе вельмі абмежаваныя, таму ўсё дасканальна адпрацоўваецца на Зямлі.

Нашы кандыдаты праходзяць вельмі сур'ёзны курс фізічнай падрыхтоўкі, які складаецца з дастаткова спецыфічных заняткаў: гэта батут, плаванне, скачкі ў ваду, для навучання каардынацыі, выносівасці — чаўночны бег, сілавыя практыкаванні, трэніроўкі вестыбулярнага апарату. Для дзяўчат ніякіх скідак не робіцца. Нарматывы агульныя і для мужчын, і для жанчын. Дарэчы, на бягучы момант у расійскім атрадзе касманаўтаў ёсць толькі адна жанчына, Ганна Кікіна.

Таксама любы ўдзельнік касмічных палётаў павінен быць навучаны дзеянням у нестандартных сітуацыях. Нашы дзяўчаты навучаюцца, як граматна рэагаваць на няштатныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць падчас касмічнага палёту і пры пасадцы. У лістападзе прайшлі відовішчныя заняткі ў гідралабараторыі Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў, дзе адпрацоўваліся дзеянні экіпажаў у выпадку няштатнага прывадненя спускальнага апарата касмічнага карабля. 14 снежня з дубліруючым экіпажам і 15 снежня — з асноўным прайшлі практычныя заняткі на мясцовасці, так званае «зімовае выжыванне» пры няштатным прызямленні спускальнага апарата касмічнага карабля ў лясістай мясцовасці ў зімовых умовах.

Раней дзяўчаты прайшлі падрыхтоўку па дзеяннях ва ўмовах бязважкасці на спецыяльным самалёце-лабараторыі. У безапорным стане яны выконвалі практыкаванні, перамяшчаліся па самалёце ад борта да борта, адпрацоўвалі навыкі арыентацыі цела ў прасторы, работы з грузамі і вадкасцю. Адпрацоўвалі гэтыя навыкі і ў скафандры, а таксама вучыліся правільна яго апранаць і здымаць ва ўмовах бязважкасці.

Навуковая праграма для нашага ўдзельніка касмічнага палёту была распрацавана Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, карпарацыяй «Раскосмас» і Расійскай акадэміяй навук. Ёй прадугледжаны шэраг эксперыментаў, так званых мэтавых работ па дыстанцыйным зандзіраванні Зямлі з выкарыстаннем апаратуры фота- і відэаздымкі беларускай вытворчасці, якая знаходзіцца на МКС, даследаванні ў вобласці біялогіі, фізіялогіі, аўтаномнага функцыянавання касмічных станцый. Таксама прадуглежана вывучэнне ўласцівасцяў лактаферыну і прабіётыкаў, распрацаваных арганізацыямі НАН з мэтай іх наступнага магчымага выкарыстання для стварэння прадуктаў харчавання для касманаўтаў. Яшчэ адзін эксперымент звязаны з 3D-біяпрынтынгам.

— І напрыканцы пытанне да ўсіх: чаму ўсё ж для Беларусі так важна быць касмічнай дзяржавай?

Пётр ВІЦЯЗЬ: Па-першае, тое, што працуе ў космасе, і на Зямлі будзе працаваць яшчэ лепш і больш надзейна, таму што космас — гэта лакаматыў для стварэння новых матэрыялаў, новых тэхналогій і новых рашэнняў. Навука павінна ствараць такія тэхналогіі, якія будуць сябе акупляць, спрашчаць і паляпшаць жыццё чалавека, як тая ж навігацыя ў нашым смартфоне. Па-другое, мы па сённяшні дзень не ведаем, адкуль з'явілася жыццё на Зямлі, а вывучэнне космасу павінна даць адказ на гэта пытанне. Таму людзі здаўна і цягнуцца да зорак...

Сяргей ЧЫЖЫК: Кажуць, што космас — гэта мара. А я сказаў бы, што космас — гэта яшчэ і будучыня: дадатковыя рэсурсы ва ўмовах катаклізмаў, выратаванне планеты ад непажаданага ўздзеяння. У любым выпадку такая перспектыва ўжо не падаецца такой фантастычнай. Але галоўнае: калі ты з'яўляешся касмічнай дзяржавай, то ўваходзіш у кола тэхналагічна развітых краін. Космас цягне за сабой усю навуку. Вывучаючы космас, мы спазнаём сябе і Зямлю. Бывае, што вялікае прасцей убачыць толькі з адлегласці. А касмічныя адлегласці ў гэтым дапамагаюць. Вывучаючы космас, мы бачым, як змяняецца іонасфера, як змяняецца клімат на нашай планеце....

Іван БУЧА: Удзел у даследаванні космасу могуць дазволіць сабе толькі высокатэхналагічныя краіны. Быць даследчыкам касмічнай прасторы — гэта значыць, іграць у вышэйшай лізе. А ўдзел беларускіх вучоных у асваенні комасу і ў савецкія часы, і ў часы незалежнай Беларусі сведчыць аб тым, што ўзровень развіцця навукі і тэхналогій ў нашай краіне вельмі высокі. У многіх пытаннях мы можам нароўні канкурыраваць з замежнымі калегамі. Менавіта экраны, распрацаваныя беларускімі вучонымі, забяспечваюць ахову японскага спадарожніка ад уздзеяння неспрыяльных фактараў касмічнай прасторы ў яго палёце да Меркурыя.

А што датычыцца запланаванага касмічнага палёту адной з нашых дзяўчат, то, на маю думку, Беларусь, якой ёсць што прапанаваць краіне з больш чым васцідзесяцігадовым вопытам дзейнасці ў галіне пілатуемай касманаўтыкі і якая можа на роўных прыняць удзел у фарміраванні навуковай праграмы свайго касманаўта, мае права ўдзельнічаць у пілатуемых касмічных праектах.

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Размова па сутнасці

ВЕРШЫ І ВАЙНА. Ў БЕЛАРУСКАЙ

«Мы скора прыйдзем з песнямі дадому. З дарог вайны ў хаты прынясём жывое рэха ўшчуленага грому і сэрцы, гартаваныя агнём...» Колькі шэдэўраў нарадзіла балючая тэма вайны ў беларускай паэзіі! У 2024-м мы будзем адзначаць 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Зразумела, прагучыць і шмат вершаў. Але ці асэнсавалі мы, ахапілі ўвесь вялізны скарб беларускай паэзіі, якая нарадзілася ў часы Вялікай Айчыннай вайны ці пазней, створаная яе ўдзельнікамі і сведкамі? Ці ведаем усе вартыя творы? Ці ёсць адметнасць у беларускай паэзіі на ваенную тэматыку? Пра гэта на круглым стале «Звязды» гаварыць Яўген Гарадніцкі, доктар філалагічных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, Васіліна Міцкевіч, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Міхал Бараноўскі, дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, і мадэратар размовы рэдактар аддзела культуры газеты «Звязда» Людміла Рублеўская.

Яўген ГАРАДНІЦКІ.

Алена МАКАРАНКА.

«Беларусь, я твой воін адданы і сын...»

— На тэму Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі пісалі і паэты-франтавікі, многія з якіх загінулі, — даследчык Алесь Бельскі склаў з іх твораў трохтомную анталогію «Скрыжалі памяці». Некаторыя выжылі і змаглі асэнсаваць перажытае ў пазнейшай творчасці. Пісалі і дзеці вайны, і тыя, хто яе не застаў. Вялізны пласт — ад шэдэўраў да фармальнай патэтыкі. Усе прымаюць як дадзенасць, што ваенная тэма — магістральная для беларускай паэзіі... Але ва ўсіх літаратурах свету ёсць вершы і паэмы пра вайну і яе ахвяраў. Чым адметная ў гэтым плане менавіта наша нацыянальная паэзія?

А. Макаранка: У нашым архіве-музеі захоўваецца шмат фондаў паэтаў-франтавікоў. У Вялікую Айчынную вайну Беларусь была цалкам акупаваная, і ў дзённікавых запісах увесь час гучыць: «Як там мая сям'я? Як мая каханая, мае дзеці?» Памятаю, у адным з запісаў аўтар перажывае, ці пазнае яго сын праз чатыры гады. Гэты ж боль адбіўся і ў творах. І яшчэ асаблівасць — партызанская тэматыка. Калі я працавала ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у фондзе Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, створанай яшчэ ў канцы 1942 года, і ў аб'яднаных архіўных фондах партызанскіх фарміраванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны, сустракала шмат вершаў партызан.

Я. Гарадніцкі: Паэзія — вельмі складаная, тонкая з'ява. Яе трэба разглядаць у кантэксце ўсяго літаратурнага развіцця. Калі параўноўваць паэзію і прозу на ваенную тэму, у 1950-я гады была цяга аўтараў да эпічнасці, панарамнасці, маштабнасці. У прозе толькі ў 1960-х атрымлівае прызнанне так званая лейтэнанцкая, акопная проза, у беларускай літаратуры яе прадстаўляе Васіль Быкаў. Тое самае адбывалася і ў паэзіі.

А. Макаранка: Імкненне паказаць вайну эпічнай падзеяй было заўсёды, і ў 1960-х, і пазней. Дарэчы, твораў празаікаў на ваенную тэму ў нашых фондах усё ж такі болей, чым паэтаў.

Я. Гарадніцкі: А чаму мала захавалася вершаў, напісаных на фронце? Таму, што многія з аўтараў загінулі. У Доме літаратара ёсць мемарыяльная дошка, на якой пазначаны 26 імёнаў загінулых у Вялікую Айчынную вайну сяброў Саюза пісьменнікаў. Гэтыя паэты да вайны паспелі выдаць адзін-два зборнічкі, у асноўным грамадзянскай лірыкі. Яны не паспелі асэнсаваць вайну. Седзячы ў акопе, гэта зрабіць цяжка. Там страляць трэба, змагацца... Усё асноўнае асэнсаванне прыйшло пасля. Паэзія хоць і заснаваная на «тут і цяпер», на непасрэдных адчуваннях, але ў той жа час яна патрабуе нейкага абагульнення, тыпізацыі, пераасэнсавання...

— Значыць, паэзія, якая пісалася ў акопах, і паэзія, якая пісалася тым самым паэтам, але пасля вайны, — іншага ўзроўню?

Я. Гарадніцкі: Іншы ўзровень пранікнення ў сутнасць падзей, асэнсавання адчуванняў чалавека на вайне, рэтраспектыўны позірк. Яны ж не маглі пісаць у акопах паэмы. Самы яскравы прыклад — Аляксей Пысін. У 1950-я ён таксама пісаў вершы на розныя тэмы ў духу часу — і пра калгасы, і пра даярак... Але якія вершы пра вайну ён стварыў пазней!

А. Макаранка: Шмат хто з паэтаў-франтавікоў рабіў дзённікавыя запісы. Урыўкамі, калі была магчымасць. Хоць гэта было і забаронена. Аўтар рабіў накіды вершаў, занатоўваў вобразы. А пасля на аснове тых нататак, накідаў з'яўляліся добрыя творы. Так, асэнсаванне прыйшло пасля... Але нататкі рабіліся непасрэдна на фронце.

В. Міцкевіч: Канешне, будучы ў акопе, напэўна, вельмі складана пісаць вершы, таму што рэч пра тое, як выратаваць сваё жыццё і выратаваць сваю краіну ад ворагаў. А франтавыя дзённікавыя запісы — цікавая частка спадчыны ўсіх аўтараў. Іх трэба выдаваць. Дзённікі Мікалая Красоўскага, які працаваў у Беларускім штабе партызанскага руху, нядаўна выходзілі ў «Нёмане». Там шмат згадак пра беларускіх паэтаў, у тым ліку пра Якуба Коласа, Купалу і тагачаснае франтавое жыццё. Мне здаецца, што папулярызацыя такіх твораў — адна з нашых сённяшніх задач.

М. Бараноўскі: Адметнасць беларускай паэзіі пра вайну для мяне вызначаецца дзвюма фармулёўкамі: «Ніколі зноў» і «Нельга забыць». Героіка, але абавязкова і трагедыйнасць.

«Нясцерпнай смагай сэрца засмучона. Былое ўспамінаецца часцей»

А. Макаранка: Наконт асэнсавання праз час... Мы знайшлі цікавы ліст 1975 года, адасланы з Масквы журналісткай, удавой савецкага воіна Валянцінай Салаўёвай Аркадзю Куляшову. Ён датычыцца камісара Зуева, пра якога Куляшоў напісаў у паэме «Сцяг брыгады». Журналістка, натхніўшыся паэмай, напісала верш пра Зуева, з якім паспяхова выступала ў вайсковых часцях. Але адзін з рэдактараў Ваенвыдата сказаў, каб яна больш не выступала з гэтым вершам, бо Зуеў нібыта ўласавец, да таго ж, паводле сюжэта, яго прадае савецкі чалавек, пра гэта таксама не трэба гаварыць. Але Куляшоў у публікацыі ў «Литературной газете» даводзіць, што Зуеў, якога паэт ведаў асабіста, ніякага дачынення да ўласаўцаў не мае, ён герой. Салаўёва выказвае ўдзячнасць Куляшову. Так што творы пра вайну — гэта вялікая адказнасць. Вобразы ўражвалі чытачоў, падхоплівалися... Недакладнасці біяграфій герояў маглі паўплываць на лёсы.

— Так, былі прыклады, калі літаратар з-за недахопу інфармацыі альбо падманутый фальсіфікаванымі акупантамі фактамі апісваў героя, у якога быў рэальны прататып як здрадніка ці наадварот... Але мог і аднавіць справядлівасць — згадваецца «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, дзе выкарыстана гісторыя мінскага падпольшчыка прафесара Яўгена Клумава, які пазней быў адзначаны званнем Героя Савецкага Саюза.

В. Міцкевіч: Хоць Якуб Колас і не быў франтавіком, вайну ён бачыў. Эвакуіраваліся з сям'ёй з палаючага Мінска. Трапілі пад бамбёжку нямецкіх самалётаў пад Оршай. Дзякуй Богу, што дапамог Купала і даслаў машыну. Сям'я Якуба Коласа, як і сам паэт, змаглі адзін дзень адпачыць на купалавым лецішчы ў Ляўках. Застацца надоўга не выпадала, вайна вымушала рушыць далей...

Страшныя першыя дні вайны паўставалі перад Якубам Коласам, і, канешне, ён адгукаўся сваімі вершамі. Першы яго такі верш, які з'явіўся ў друку, — «Шалёнага пса на ланцуг». Ён быў надрукаваны 23 чэрвеня 1941 года і ў «Звяздзе», і ў «Савецкай Беларусі», і нават газета «Правда» дала яго без перакладу. Колас вельмі цікавіўся падзеямі на фронце, слухаў радыё і ўвесь час адгукаўся сваімі вершамі. Яны вельмі вядомыя, за цыкл вершаў на ваенную тэматыку яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія па літаратуры. Але ў Коласа ёсць творы, якія не так шырока вядомы сённяшняму чытачу. Дзве паэмы пісаліся падчас вайны — «Суд у лесе» і «Адплата». Яны прысвечаны беларускім партызанам і заслугоўваюць увагі. Ёсць у Коласа і невялікія апавяданні пра вайну — «Санітарка Таня», «У разведцы», «Сустрэча з ворагам». Яны вельмі добра падыходзяць для патрыятычнага выхавання дзяцей.

М. Бараноўскі: Аднойчы я вырашыў здзейсніць асабісты праект — шукаць вершы на ваенную тэматыку, якія мне асабіста падабаюцца, і дзяліцца імі ў сацыяльных сетках. Але знайсці для сябе нешта знакавае аказалася цяжка. Вельмі своечасова арганізаваны гэты круглы стол, бо мы можам якраз абгаварыць небяспеку ўпасці замест звароту да добрых твораў, якія кранаюць, уражваюць, выхоўваюць, у пафас. Мікола Сурначоў, які загінуў на фронце, напісаў на пачатку вайны верш «У стоптаным жыце». У школе я гэтага верша не чуў. І каб не падказка сяброў-філолагаў, на яго б, напэўна, і не выйшаў бы. А гэта вяршыня паэзіі! «Ляжыць ён, як віцязь, у стоптаным жыце. Маці спаткаеце — ёй не кажыце». Трэба стварыць канон лепшай паэзіі пра вайну, не прыцягваючы туды штосьці штучна.

Я. Гарадніцкі: Так, паэзію франтавікоў трэба ведаць, іх усіх трэба шанаваць. Але гэта не значыць, што ўсё імі напісанае высокай мастацкай якасці. Сапраўдная паэзія па-за часам. Мне згадаўся адзін твор, дзе таксама ляжыць забіты салдат — ён належыць ведаеце, каму? Максіму Багдановічу. Яго твор пра вайну — абразок «Страшна». Адбыўся бой. Ляжаць забітыя. Вось салдат ляжыць, нібы адпачывае, глядзіць на неба, на хмаркі. І адна дэталь: вялікі рыжы муравей спаўзае з яго чупрыны, паўзе па скроні, а потым па расплюшчаных вачах. Вось як можа адна дэталь стварыць геніяльны твор, які актуальны ва ўсе часы...

— Вельмі важна, каб захоўвалася гістарычная памяць, каб не разбураўся гістарычны кантэкст... Вось, напрыклад, вельмі просты верш-чатырохрадкоўе Анатоля Вялюгіна «Лемантар вайны»: «Мама мыла раму — там, на ўроку рана. Вісне ў небе «рама», што забіла маму». Верш уражлівы... Але для таго, хто ведае, што рамай называлі нямецкі самалёт-разведчык.

М. Бараноўскі: Сённяшнія дзеці без тлумачэнняў не зразумеюць. Тэма вайны — складаная, праўду пра вайну не ўсе гатовыя былі прыняць. І тут яшчэ шмат таямніц.

«Я бяру з сабой ліст і цалую пры ўсіх, і да сэрца кладу, каб ад куль захаваць...»

— Ці ўсе вартыя творы на тэму Вялікай Айчыннай вайны вывучаныя, данесеныя да чытача, ці ёсць невядомыя або незаслужана забытыя? Можа, дзе-небудзь яшчэ ў гільзе, у агульнай магіле ляжыць нататнік з геніяльным вершам...

А. Макаранка: У Нацыянальным архіве выйшла цудоўная кніга ілюстрацый з партызанскіх дзённікаў. Ёсць там і вершы, якія асобна не друкаваліся. Я працавала над кнігай «Мы жылі ў буднях барацьбы», у якой сабраны франтавыя дзённікі чатырох пісьменнікаў. І там таксама ёсць вершы, асабліва шмат у дзённіку Пятра Валкадаева, які прайшоў усю вайну, у 1944-м ваяваў у партызанскім атрадзе. Некаторыя старонкі тых дзённікаў — як замалёўкі для будучых твораў.

Я. Гарадніцкі: Вядома, у архівах можна яшчэ шмат знайсці непасрэдных сведчанняў удзельнікаў вайны, знойдуцца там і іх вершы. Іншая справа — мастацкі ўзровень, ён не заўсёды можа быць высокі. Як жартоўна кажуць, добрых вершаў мала ў каго многа... А на тэму вайны напісаць шэдэўр складана. Нават у такіх паэтаў, як Куляшоў і Танк, іх не так багата.

— Значыць, трэба не толькі знаходзіць тое, што яшчэ не вядома, але і аднаўляць цікавасць да паэтаў франтавога пакалення, чые творы даўно не перавыдаваліся?

Я. Гарадніцкі: Так. Згадваецца верш Максіма Танка пра подзвіг Януша Корчака, які загінуў у Асвенціме разам са сваімі выхаванцамі, яўрэйскімі дзецьмі. Ён просты, без асаблівай патэтыкі... Або верш Анатоля Вярцінскага «Дынамік»... Пра старую ўдаву, сыны якой загінулі, і яна прынесла да электрыка сапсаванае радыё — свайго адзінага суразмоўцу. Згадаю яшчэ паэму Алеся Наўроцкага «Палячыце нас, доктар». Ён усё жыццё дапісваў гэты твор, які выйшаў у першым яго зборніку. Пра людзей, пакалечаных вайной, але якія не зламаліся духоўна. Але асабліва мяне ўразіла паэзія Аляксея Пысіна, са школьных часоў. Элегічнасць, шчырасць, вера ў перамогу жыцця... Яго мы не вельмі часта згадваем.

М. Бараноўскі: Часам вока ў нас «замыленае». Мы аддаём шмат увагі лаўрэатам, тытулаваным літаратарам, забываючы не менш вартых. Я згодны наконт Аляксея Пысіна. На мой погляд, яго імя варта надаць не толькі вуліцы, але і, скажам, заснаваць прэмію яго імя. Чаму паэма «Палячыце нас, доктар» Алеся Наўроцкага не на слыху — здзіўляе. Я змяшчаў урыўкі ў сваім блогу. Згадаю верш Барадуліна «Бацьку». Не так часта бачу, як мужчыны плачуць, але калі мой калега агучваў гэты твор, ён плакаў. Мы амаль не гаварылі пра жанчын-паэтак... Даволі часта згадваецца Яўгенія Пфляўмбаўм, і няхай яна не была на фронце, але важна, што ў яе праз моц паэтычнага таленту перадаецца атмасфера ваеннага часу.

— Давайце пагартаем выданні... У аб'ёмным 19-м томе «Залатой калекцыі беларускай літаратуры» выдавецтва «Мастацкая літаратура», дзе прадстаўлена паэзія вайны, тры паэткі — Ніна Тарас, Эдзі Агняцвет, Канстанцыя Буйло. У зборніку «Памяці вечны агонь» з серыі «100 вершаў», выдадзеным да 75-годдзя вызвалення Беларусі, з гэтых ста вершаў ніводнага, напісанага жанчынай. Не думаю, што, каб пашукаць, такіх вершаў не знайшлося б. — А яшчэ думаю, што фальклорныя творы на тэму вайны — а ў Беларусі найбагаты пласт такога фальклору — амаль цалкам створаны жанчынамі.

М. Бараноўскі: Беларуская народная творчасць пра вайну таксама вартая папулярызацыі. Навукоўцы шмат зрабілі ў гэтым кірун-

ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ПАЭЗІЯ

Міхал БАРАНОЎСКІ.

Васіліна МІЦКЕВІЧ.

ку, і вылучыць нешта цікавае можна.

В. Міцкевіч: І ў музеях, і ў архівах ёсць рукапісы сведкаў вайны. Можа, у некаторых знойдуцца іх адзіныя паэтычныя творы, яны варты вывучэння. У музеі Якуба Коласа, напрыклад, маецца рукапісны сшытак «Голас Беразянкі» Яніны Крайнік, партызанкі брыгады «Полымя». У сваёй паэме яна расказала пра спаленую пухавіцкую вёску.

— Калі мне даводзіцца праглядаць у архіве газетныя выразкі ваеннага часу, я нярэдка знаходжу ў журналісцкіх матэрыялах пра жыццё ў партызанскіх лагерах, культурную працу на фронце, шмат узораў творчасці салдат і партызан. Падазраю, што многае з тых твораў засталося толькі ў тых газетных публікацыях. Таксама крыніца, якой не варта пагарджаць.

М. Бараноўскі: Тым болей Прэзідэнцкая бібліятэка алічбавала шмат перыядычных выданняў ваеннага часу.

А. Макаранка: Варта паглядзець у Нацыянальным архіве фонды Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там ёсць дакументы, якія датычацца дзяржзаказаў паэтам на напісанне твораў пра герояў вайны. Помніцца, там ёсць і рукапісы.

«Ну што ж, не сорам, родныя, паплачце...»

— Няма такога чалавека, які б жыў у той час і якому б вайна не пераламала жыццё, не перавярнула ўспрыманне свету. Тым болей гэта паўплывала на паэтаў і пісьменнікаў. Мы згадвалі Яўгенію Пфляўмбаўм. Яна паехала ў Сібір да зняволенага мужа, паэта Максіма Лужаніна, потым яны жылі ў Маскве. І перад вайной іх адносіны разладзіліся — з ліставання вынікае, як гэта было для абодвух пакутліва... Але раз'ехаліся. А калі пачалася вайна, Лужанін трапіў на фронт. Ён ваяваў, удзельнічаў у Сталінградскай бітве, быў паранены. І ўсе іх непаразуменні з Яўгеніяй забыліся. Яны пішуць адзін аднаму лісты, поўныя палкага кахання. Яўгенія дачакалася свайго «Аля», разам вярнуліся ў вызвалены Мінск. Вайна выявіла рэальныя каштоўнасці, якімі трэба даражыць. А згадаем Міхася Лынькова, чый сын Марык і жонка загінулі ў канцлагеры. Ён да канца жыцця так і не аправіўся ад гэтай трагедыі.

В. Міцкевіч: Лынькова хацелі ўключыць у камісію па расследаванні злачынстваў акупантаў, але Колас прыклаў усе намаганні, каб яго не ўключалі, — Лынькову было гэта вельмі цяжка.

— Пра яго сямейную трагедыю напісаў Янка Маўр, апавяданне «Завошта?». Сам Лынькоў не змог. Пісаў пра падобнае, напрыклад, апавяданне «Дзіцячы башмачок», але пра сваю сям'ю, відаць, сіл не меў душэўных выказацца.

Я. Гарадніцкі: Але ж напісаў ён эпапею «Векапомныя дні», якая, аднак, не дацягвала па мастацкім узроўні.

— Мне здаецца, што ён свой боль спрабаваў прыгаварыць такой фундаментальнай працай. Як бы і пра вайну, але не пра ўласную трагедыю. Ад асабістай трагедыі паэты ішлі да агульнанацыянальнага і агульначалавечага... Але часам і да патэтыкі. Згадаю паэму Петруся Броўкі, прысвечаную яго маці — яна загінула ў канцлагеры, пайшла ў агонь крэматорыя, замяніўшы сабой маладзенькую дзяўчыну. Сюжэт, варты Шэкспіра і Еўрыпіда. Броўка пра гэта піша толькі ў адной частцы паэмы...

М. Бараноўскі: На першых дзвюх старонках.

Я. Гарадніцкі: Але мы не можам асуджаць паэта — магчыма, гэта ў яго натуральна спалучалася.

А. Макаранка: А як аб гэтым, балючым, яму было пісаць? Ён не мог.

М. Бараноўскі: Ён не мог. А нехта мог. І мы павінны такіх паэтаў вылучаць. Тады для кожнага з літаратараў быў абавязак — адгукнуцца на падзеі вайны. Многія рэчы, асабліва эпічнага характару, пісаліся на дзяржзамову.

— Можа, для каго была і дзяржзамова, але калі Аркадзь Куляшоў выходзіць пад бамбёжкай з Мінска, ці калі Якуб Колас пакутліва шукае хоць якой звестачкі пра сына Юрку, які пайшоў на фронт, — тут ужо не дзяржзамова, тут асабістае пакланне выказацца...

Я. Гарадніцкі: Канешне, асабістая жыццёвая трагедыя адбіваецца на творчасці. Але глыбіня твору залежыць ад таленту.

В. Міцкевіч: Шмат вершаў пра вайну Якуба Коласа напісана пад ураджаннем уласна перажытага. Верш «Развітанне» прысвечаны яго дзядзьку, Ігнату Юр'евічу Міцкевіч... Ёсць верш, прысвечаны сыну Юрку, апошні ліст з фронту ад якога прыйшоў у верасні 1941 года. На Коласа вялікае ўражанне зрабіла тое, што ён пабачыў у вызваленым Мінску. У дзённікавых запісах, у артыкулах шмат запісаў: «Ты спалены датла, але ты прыгожы ў сваіх руінах». Але ў кожным яго творы ёсць вера, што ўсё будзе адноўлена.

А. Макаранка: Не нам судзіць людзей, якія прайшлі праз тыя жахі. Мая родная бабуля была ў Малым Трасцянцы, шмат чаго бачыла... Колькі я, гісторык, спрабавала яе распытаць — яна маўчала. З мамінага боку бабуля і яе сястра прайшлі Асвенцым — таксама маўчалі.

— У маёй бабулі Пелагеі Часлаўскай на руцэ быў выбіты нумар — яна трапіла ў канцлагер Азарычы, калі карнікі спалілі вёску за сувязь з партызанамі. Вярнулася пасля вызвалення, хворая на тыф. Колькі я пыталася, што гэта за нумар на яе руцэ, — «Ай, не пытайся. Не звяртай увагі».

М. Бараноўскі: Таму што ўсё ў рэальным жыцці складаней, чым у агітцы. Не ўсё можна агучыць.

«Попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі: Памятай! Памятай! Памятай!»

— Што варта зрабіць для таго, каб папулярызаваць лепшыя творы пра вайну, зацікавіць гэтай тэмай сучасных дзяцей?

В. Міцкевіч: Мне падаецца выключнай у гэтым плане кніга «Ніколі не забудзем», над якой працавалі мае абодва прадзеды, Янка Маўр і Якуб Колас: успаміны дзяцей, якія былі сведкамі вайны. Цяпер не хапае ўвагі менавіта да такіх кніг. Мне вельмі цікавыя дзённікі сведкаў вайны. Колас таксама пісаў дзённік, і там вельмі шмат інфармацыі аб тым, як ён перажываў падзеі, якія адбываліся на фронце. Другі мой прадзед, Янка Маўр, таксама адгукнуўся на гэтую тэму. Яго творы такія кранальныя, што іх немагчыма чытаць без слёз і заразы. І «Сям'я», і «Максімка», і «Дом пры дарозе», і «Драўляная лыжка» — творы, якія павінна ведаць сённяшняе юнае пакаленне беларусаў. У Янкі Маўра ёсць і тое, што не публікавалася. У часопісе «Полымя» да 130-годдзя Янкі Маўра выйшла першая частка незавершанага рамана «Дзяўчына-маці», прысвечанага мінскаму гета. І ёсць яшчэ ў Маўра накіды твораў «На рацэ Бярэзіне», «Эшалон нявольнікаў», якія таксама ніколі не друкаваліся. Мне падаецца, што было б добра выдаць кнігу апавяданняў і невядомых твораў Янкі Маўра на тэму вайны.

А. Макаранка: Што датычыцца ўспамінаў Янкі Маўра — у нас захоўваецца ўсяго адна староначка, з 22 чэрвеня па 26 чэрвеня 1941 года. Тэкст «згасаючы», драбнюткі, дрэнна расчытваецца. Нагадаю, што ў наступным годзе не толькі юбілей Перамогі, але і юбілеі літаратараў-франтавікоў Аркадзя Куляшова і Васіля Быкава. Калі мы пачалі разглядаць фонд Аркадзя Куляшова, аказалася, што ў нас ёсць яшчэ неразабраныя тэчкі. А ў іх мы знайшлі рукапіс паэмы «Сцяг брыгады» 1942—1943 года з праўкамі аўтара.

М. Бараноўскі: Калі будуць канцэрты да дня вызвалення Беларусі, важна, каб гучалі песні на лепшыя тэксты беларускіх паэтаў.

Я. Гарадніцкі: Чаму б не стварыць праграму на вершы Аляксея Пысіна?

М. Бараноўскі: Нагадаю, што ў «Песняроў» была праграма «Праз усю вайну». Можа, ёсць сэнс яе аднавіць?

Я. Гарадніцкі: Толькі трэба асцерагацца патэтыкі. Каб гэта было шчыра і пранікнёна.

— Безумоўна, па краіне пройдзе шмат тэматычных літаратурных конкурсаў, конкурсаў чытальнікаў... Напрыклад, Мінскае гарадское аддзяленне СПБ ужо аб'явіла літаратурны конкурс, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Мінска і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

А. Макаранка: У наступным годзе юбілей Саюза пісьменнікаў Беларусі, у нашым архіве шмат дакументаў паэтаў-франтавікоў. Так што плануем шмат мерапрыемстваў. У лютым, напрыклад, вечар памяці Аркадзя Куляшова.

В. Міцкевіч: У нашым музеі рыхтуецца вялікі выставачны праект да вызвалення Мінска. Будзем згадваць творчасць Якуба Коласа ваеннай тэматыкі. Паколькі Колас правёў два з паловай года ў эвакуацыі ва Узбекістане, прадставім работы вядомай беларускай архітэктаркі Галіны Левінай — краявіды Узбекістана, а таксама творы, прысвечаныя Мінску.

Я. Гарадніцкі: Я прапанаваў бы да юбілею Аляксея Пысіна выдаць збор твораў гэтага геніяльнага паэта. У яго родным Магілёве ёсць вуліца яго імя. Добра было б назваць яго імем вуліцу і ў Мінску, а таксама даць вуліцам імёны паэтаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СУПРЭМАТЫЧНАЯ КАЗКА ПАД ЗНАКАМ ОПЕРЫ

«Прачытаў «Любоў да трох апельсінаў». А здорава! З гэтага можна тое-сёе зрабіць, толькі папярэдне перарабіць сюжэт наноў. Музыка — ясная, жывая і, па магчымасці, простая».

Так запісаў у сваім дзённіку 26 красавіка 1918 года кампазітар Сяргей Пракоф'еў, якому перад ад'ездам яго з Расіі Меерхольд даў часопіс са сцэнарыем па знакамітай п'есе драматурга XVIII стагоддзя, венецыянца Карла Гоцы. І ўгаварыў паспрабаваць напісаць оперу.

І твор геніяльнага Пракоф'ева, натхнёны ідэяй меерхольдаўцаў, гарэзны, відовішчны, казачна-абсурдны і глыбока філасофскі, з'явіўся і дасюль займае асаблівае месца ў гісторыі музыкі. Упершыню быў пастаўлены на французскай мове ў 1921 годзе ў Чыкага. Але звяртаюцца да яго не так часта, таму што пры ўяўнай простасці гэта вельмі складаны твор. Таму для беларускага гледача вялікім падарункам аказаўся прывезены Самарскім акадэмічным тэатрам оперы і балета імя Д. Д. Шастаковіча на XIII Мінскі міжнародны Калядны оперны форум спектакль «Любоў да трох апельсінаў».

— Мы лічым, што гэта адзін з самых жыццесцвярджальных, аптымістычных і радасных спектакляў, таму што яго напісаў малады Пракоф'еў, які ў той час шчаслівы, шмат падарожнічаў, радаваўся жыццю. Музыка яркая, вобразная, задзірлівая... І, мне здаецца, наш спектакль адпавядае музыцы, асабліва касцюмы і сцэнаграфія. Сам Пракоф'еў вельмі любіў гэты твор, — патлумачыў выбар менавіта такога спектакля для паказу ў Мінску **мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор самарскага тэатра Яўген ХАХЛОЎ.** — Мы ўпэўненыя, што прывезлі тое, што вы ніколі раней не чулі, тое, чым мы маглі б здзівіць беларускую публіку.

Саліст самарскай оперы Іван ВОЛКАЎ, які выконвае ў спектаклі партыю Прынца, прызнаўся, што для яго гэтая партыя была першай працай з музыкай Сяргея Пракоф'ева.

— Каб выконваць яго музыку, трэба зразумець яго філасофію, — сцвярджае малады спявак. — Музыка эмацыйная, вострахарактарная. Ёсць шмат складанасцяў, але што зробіш, тэнару трэба спраўляцца з усім, што напісана кампазітарам, нічога страшнага. Але музыка звязана і з акцёрскім выкананнем — у музыцы ты павінен быць дакладным, а ў акцёрскай гульні ўвесь час шукаеш і знаходзіш новыя фарбы. Кожны спектакль атрымліваецца па-новаму.

Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына ДУЛАВА адзначыла, што прыезд на Мінскі міжнародны Калядны оперны форум адразу двух значных тэатраў у поўным складзе — Вялікага тэатра Узбекістана імя А. Наваі і Самарскага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Д. Д. Шастаковіча — вялікая падзея. Гэта сотні людзей, якія прывозяць сваю культуру, свой погляд на мастацтва. З Самарскім тэатрам Вялікі тэатр Беларусі падпісаў дагавор аб супрацоўніцтве. У планах — не толькі гастролі, але і абмен салістамі, і нават сумесная пастаноўка, для якой абрана опера Міхаіла Глінкі «Руслан і Людміла».

Для самарскага тэатра гэта першы выезд у Беларусь, таму перад спектаклем усе артысты вельмі хваляваліся і цалкам выкладваліся на сцэне. Але ўжо з першай сцэны кожны беларускі глядач, які ведае не толькі кантэкст сусветнага мастацтва, але і гісторыю беларускага, павінен быў адчуць нешта блізкае, роднае, што закране душу, бо адразу апынуўся ў свеце супрэматызму. Таго самага, што гадаваўся і расцвітаў у Віцебску. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Наталля Дычэнка знайшла свой шлях паміж знакавымі сусветнымі інтэрпрэтацыямі «Любові да трох апельсінаў». Мы бачым, як ажываюць добра вядомыя вобразы Кандзінскага і Малевіча, мы пераносімся ў часы 1919—1922 гг., калі ў Віцебску дзейнічаў УНОВІС. Бачым касцюмы, яркія, дзіўнаватыя, якія спалучаюць і дух супрэматызму, і дух італьянскага тэатра дэль артэ... Дадаць вобразы тэатра Меерхольда, з яго канструкцыямі і пластыкай, — і можаце ўявіць, якое ўнікальнае дзейства падарылі беларускім гледачам. Якія пабачылі і чорны Малевічаў квадрат, і чырвоны. Прычым на нашых вачах чырвоны квадрат ператвараецца ў круг — і робіцца супрэматычным сонцам... Ды нават славутыя тры апельсіны, якія як толькі не вырашаліся ў розных пастаноўках, тут ператвараюцца ў тры супрэматычныя карціны, якія Прынц вязе на ровары з кошыкам. І венецыянскі карнавал, і вулічны тэатр 1920-х з фізкультурнікамі і плыўчыхамі... І нават сённяшні час з персанажамі анімэ адгукаецца. Безумоўна, трэба адзначыць працу мастака-пастаноўшчыка Алены Салаўёвай і мастака па касцюмах Наталлі Земаліндзінавай. Але без сладжанай, адданай працы артыстаў дэкарацыі засталіся б на ўзроўні цікавай карцінкі... Ды стварыўся сапраўдны сінтэз, персанажы жывуць на сцэне, відаць, што артысты самі ўключыліся ў гульню. А дружны рогат залы, калі з'яўляецца магутная Кухарка, узброеная чарпаком (Рэнат Латыпаў), ці калі Труфальдзіна (лаўрэат Нацыянальнай прэміі «Анегін» Анатоль Няўдах) падскоквае пад жэстамі суразмоўцы як мячык, ці сціскаецца як складная папяровая цацка, — сведчыць, што ў гульню ўключылі і гледача.

Спектакль самарцаў стварыў сапраўды святочны настрой. А 15 снежня Мінскі міжнародны Калядны оперны форум завяршыўся гала-канцэртам.

Людміла ІВАНОВА.

«ХАРАКІРЫ» ДЛЯ ЧЫНОЎНІКАЎ

Чаму Японію раз'ядае маштабная карупцыя?

Прэм'ер-міністр Японіі Фуміё Кісіда днямі прыняў адстаўкі адразу чатырох членаў кабінета міністраў на фоне палітычнага скандалу, звязанага са зборам сродкаў і хабарамі ў найбуйнейшай фракцыі кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) краіны. Пра гэта паведаміла агенцтва Kyodo. У адстаўку пайшоў генеральны сакратар кабінета міністраў Японіі Хіракадзу Мацуна. Акрамя Мацуна, сваіх пасад пазбавіліся міністр эканомікі, гандлю і прамысловасці Ясутосі Нісімура, міністр агульнанацыянальных спраў і камунікацый Дзюндзі Судзукі, а таксама міністр сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі Іціра Міясіта. Скандал закранае некалькі фракцый ЛДП, але ў асноўным найбуйнейшую ўнутрыпартыйную групу экс-прэм'ера Сіндзо Абэ. Да яе належаць усе міністры, якія пайшлі ў адстаўку, уключаючы генеральнага сакратара ўрада Хіракадзу Мацуна. Акрамя таго, як паведамляе Kyodo, у адстаўку падалі пяць намеснікаў міністраў, адзін парламенцкі віцэ-міністр, а таксама саветнік міністра абароны. Усе яны таксама з'яўляюцца членамі фракцыі Абэ. Чаму Японію раз'ядае маштабная карупцыя?

СКАНДАЛ НА СКАНДАЛЕ

Карупцыя ў вышэйшых эшалонах улады Краіны ўзыходзячага сонца насуперак існуючым стэрэатыпам не з'яўляецца рэдкасцю. Гучныя скандалы скалынаюць мясцовую палітычную эліту перыядычна. Як адзначаюць эксперты, яны сталі часткай жыцця Японіі з 1990-х і да цяперашняга часу ператварыліся ў аб'ект пастаяннай барацьбы і ў інструмент уплыву на грамадскую думку ўнутры краіны. Чараду карупцыйных скандалаў адкрыў у 1989-м так званы «рэкруцкі скандал», калі за атрыманне хабару былі затрыманы кіраўнік дэпартамента па справах працаўладкавання міністэрства працы, намеснік міністра працы, а таксама намеснік міністра адукацыі Японіі. Акрамя таго, у адстаўку пайшлі 15 чалавек.

Цяперашні грандыёзны палітычны скандал падрывае давер да дзейнай улады на чале з прэм'ер-міністрам Фуміё Кісіда і можа перафарматаваць палітычную сістэму Краіны ўзыходзячага сонца, адзначае ukraina.ru. Вярхушку кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі Японіі выкрылі ў карупцыі, якая пры бліжэйшым разглядзе больш нагадвае звычайны крадзеж. Аказалася, што партыйныя босы ліберал-дэмакратаў на працягу многіх гадоў бессаромна запускалі руку ў партыйную касу, куды паступалі ахвяраванні ад прадстаўнікоў дзелавых колаў.

Гэтая чарада затрыманняў і звальненняў высокапастаўленых чыноўнікаў выклікала сапраўднае ўзрушэнне ў грамадстве, якое яшчэ больш узмацнілася, калі ў 1993-м па справе кампаніі «Дзэнекон» за хабарніцтва быў затрыманы намеснік міністра народнага дабрабыту Японіі, а разам з ім — яшчэ тры чалавекі, у тым ліку губернатар прэфектуры Ібаракі Такэуці Фудзіа і губернатар прэфектуры Міягі Хома Сюнтара. На працягу наступных пяці гадоў былі разбіральніцтвы па абвінавачанні ў атрыманні хабараў і злоўжыванні паўнамоцтвамі чыноўнікаў міністэрства фінансаў (скандал Нісінкумі, 1995 год), міністэрства народнага дабрабыту (скандал у сувязі з фінансаваннем дамоў састарэлых, 1996 год), а таксама міністэрства транспарту і сувязі (карупцыйны скандал у сувязі з урачыстым прыёмам у гонар Ідзуі, 1996 год, па выніках якога былі прызначаны строгія адміністрацыйныя спагнанні 6 чыноўнікам міністэрства на чале з намеснікам міністра транспарту і сувязі, а таксама кіраўніку ведамства энергетычных рэсурсаў).

Наглядна ілюструюць ступень карумпаванасці чыноўнікаў міністэрства фінансаў вынікі самага буйнога карупцыйнага скандалу 1998-м. У выніку былі затрыманы і пайшлі ў адстаўку чатыры чалавекі, сярод іх — міністр фінансаў Міцука Хіросі, першы намеснік начальніка агульнага аддзела дэпартамента страхавання Сакагібара Такасі. Скончыў жыццё самагубствам кіраўнік аддзела фінансавых аперацый банкаўскага дэпартамента міністэрства фінансаў Ацукі Еіці. Панеслі пакаранне па абвінавачанні ў перавышэнні паўнамоцтваў 32 чалавекі з кіруючага звяна, 1 чалавек пакараны пазбаўленнем на пасадзе, 17 чалавек — паніжэннем заробку, 14 чалавек атрымалі строгую вымову; яшчэ 80 чыноўнікаў міністэрства панеслі адміністрацыйныя спагнанні. Гэты скандал не толькі выклікаў рэакцыю ўнутры краіны, але і меў шырокі рэзананс за межамі Японіі.

ГОЛЬФ ЗА КОШТ КАМПАНІІ

Усе гэтыя скандалы наглядна паказалі, што карупцыя пракралася ў саму структуру дзяржаўнага апарата кіравання Японіі. І хоць часам кажуць, што гэтая з'ява ўласціва не ўсёй адміністрацыйнай структуры, а толькі шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, самую глыбокую ступень карумпаванасці выявілі ў міністэрстве фінансаў, якое кантралюе падаткі, бюджэт краіны і фінансы. Не засталіся недатычнымі і такія сферы, як абароннае ведамства і дыпламатыя. У 1998-м у абаронным ведамстве Японіі былі затрыманы два афіцэры, кіраўнік цэнтральнага аддзела забеспячэння і яго намеснік, за перавышэнне паўнамоцтваў пры арганізацыі таргоў па ўзбраенні. У выніку скандалу таксама сышлі ў адстаўку 4 чалавекі, сярод якіх — кіраўнік ведамства абароны Нукага Фукусіра і яго намеснікі, пакаранне панеслі 42 чалавекі.

Пачатак XXI стагоддзя быў таксама адзначаны шэрагам гучных спраў, у якіх замяшаныя дэпутаты парламента Японіі, частка якіх становяцца членамі кабінета міністраў, іх намеснікамі і палітычнымі саветнікамі, а таксама кіраўнікі мясцовых адміністрацый (губернатары, мэры гарадоў), дэпутаты мясцовых сходаў. Сярод асноўных карупцыйных скандалаў, у якіх фігуруюць дэпутаты парламента Японіі ці міністры з ліку дэпутатаў, можна назваць перш за ўсё скандал, звязаны з фірмай KSD, у 2000-м, скандал Мунэа Судзукі і скандал, звязаны з фірмай «Ямада Ека» ў 2007-м. Як заўважаюць эксперты, усе гэтыя справы звязаныя са з'явай зрашчэння палітыкі і бізнесу.

2002-гі адзначаны грандыёзным палітычным скандалам, звязаным з абвінавачаннем дэпутата ніжняй палаты парламента Японіі Мунэа Судзукі ў заступніцтве пры размеркаванні ўрадавых заказаў у рамках праграмы дапамогі Паўднёвым Курылам. У выніку гэтага скандалу ён быў пазбаўлены дэпутацкіх паўнамоцтваў, выгнаны з партыі і атрымаў два гады арышту. Больш за 20 буйных японскіх дыпламатаў і чыноўнікаў, у тым ліку двое паслоў, былі аштрафаваны і звольнены са сваіх пастоў, а міністр замежных спраў Кавагуці Ерыка аштрафавала сама сябе на два месячныя аклады.

У 2006-м узнік скандал у аддзеле забеспячэння абароннага ведамства Японіі, а ў 2007-м — буйны скандал з гандлёвай фірмай «Ямада Ека», якая спецыялізуецца на ваенным абсталяванні, які выявіў ступень карумпаванасці ў міністэрстве абароны. На працэсе ў такійскім судзе былы намеснік міністра абароны Японіі Такэмаса Морыя прызнаў сябе вінаватым у атрыманні 12,5 мільёна ен (прыкладна 110 тыс. долараў) у выглядзе хабараў ад кампаніі «Ямада Ека». За хабар чыноўнік закупляў у кампаніі абсталяванне на асабліва выгадных для яе ўмовах. Акрамя прамога атрымання хабару, намеснік міністра абароны каля 300 разоў гуляў у гольф і неаднаразова абедаў за кошт кампаніі ў дарагіх рэстаранах. Падчас аднаго з допытаў у парламенце Морыя заявіў, што на гэтых абедах таксама прысутнічалі самі міністры абароны — Фукусіра Нукага, а таксама Фуміё Кюма, які змяніў яго ў 2006-м.

КРУГАВАЯ ПАРУКА

Доўгі час у прэсе крытыкавалі кіраўніка кабміна Сіндзо Абэ (быў прэм'ерам у 2006—2007 і 2012—2020 гадах, знаходзіўся на гэтай пасадзе даўжэй за ўсіх у гісторыі краіны. Забіты 8 ліпеня 2022-га ў выніку ўзброенага нападзення) за дапамогу сябру сваёй сям'і ў набыцці ўчастка зямлі па заніжаным кошце, які прызначаў пад будаўніцтва адукацыйнай установы. Журналісты раскапалі дакументы, у якіх выявілі дзіўныя акалічнасці, што датычыліся пытанняў здзелкі, але канчаткова так і не змаглі даказаць дачыненне Абэ да карупцыйнай схемы. Пасля адзін з чыноўнікаў міністэрства фінансаў, які, як відаць, браў удзел у падробцы папер, скончыў жыццё самагубствам (такія здарэнні нярэдкія). Тады на фоне публікаваных даных рэйтынг падтрымкі Абэ ўвесь час вагаўся, разам з тым палітык адмаўляў сваё дачыненне да згаданага інцыдэнту і, можна сказаць, выйшаў сухім з вады.

Яшчэ адзін яскравы прыклад парушэння законаў у Японіі звязаны з былым міністрам юстыцыі Кацуюкі Каваі і яго жонкай Анры, экс-дэпутатам верхняй палаты японскага парламента. Палітычная пара, якая належала да кіруючай ЛДП, аказалася вінаватай у подкупе выбаршчыкаў. Пры гэтым Кацуюкі Кава называлі чалавекам з блізкага атачэння Сіндзо Абэ, на той момант прэм'ер-міністра краіны. Паводле некаторых звестак, падчас выбарчай кампаніі ў адной з акруг у прэфектуры Хірасіма Кацуюкі Каваі, які кіраваў перадвыбарным штабам сваёй жонкі, раздаў выбаршчыкам каля 28 мільёнаў ен (220 тысяч долараў). У сваю чаргу Анры Каваі на аналагічныя мэты пусціла каля 1,6 мільёна ен (12,6 тысячы долараў ЗША). Пасля суд прыгаварыў Кацуюкі Каваі да трох гадоў турэмнага зняволення і канфіскацыі 1,3 мільёна ен. Яго жонка атрымала 16 месяцаў турмы з адтэрміноўкай прысуду на пяць гадоў.

Цяперашні грандыёзны палітычны скандал падрывае давер да дзейнай улады на чале з прэм'ер-міністрам Фуміё Кісіда і можа перафарматаваць палітычную сістэму Краіны ўзыходзячага сонца, адзначае ukraina.ru. Вярхушку кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі Японіі выкрылі ў карупцыі, якая пры бліжэйшым разглядзе больш нагадвае звычайны крадзеж. Аказалася, што партыйныя босы ліберал-дэмакратаў на працягу многіх гадоў бессаромна запускалі руку ў партыйную касу, куды паступалі ахвяраванні ад прадстаўнікоў дзелавых колаў. А сістэма кругавой парукі, у якой фігуруюць практычна ўсе высокапастаўленыя ўрадавыя чыноўнікі, зрабіла гэтыя крадзяжы чымсьці зусім звычайным. Пра іх ведалі ўсе, але не казалі пра гэта ўслых, каб не выносіць смецце з хаты.

Выкрыццё махлярства з ахвяраваннямі стала ўскосным вынікам расследавання яшчэ аднаго рэзананснага палітычнага скандалу, які ўспыхнуў пасля забойства былога прэм'ер-міністра Японіі Сіндзо Абэ і прыадкрыў для ўсіх брудныя таямніцы японскага палітычнага істэблішменту, адзначыла ukraina.ru. Адстаўнога палітыка застрэліў Тэцуя Ямагамі, беспрацоўны, які калісьці праходзіў службу ў Марскіх сілах самаабароны Японіі. Яго маці пазбавілася сваіх зберажэнняў у выніку дзейнасці таталітарнай секты, вядомай пад назвай «Царква аб'яднання», якая гадамі карысталася заступніцтвам уплывовых палітыкаў з Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Тэрарыст-адзіночка вырашыў адпомсціць за гэта сістэме, выбраўшы сваёй ахвярай Абэ. Таму што былы прэм'ер Японіі некалі накіраваў у адрас «Царквы аб'яднання» прывітальны ліст. Падчас расследавання гэтага злачынства стала зразумела, што надзеленыя ўладай ліберал-дэмакраты актыўна ўзаемадзейнічалі з сумнеўнымі структурамі крымінальна-мафіёзнага роду. І гэтае карупцыйнае супрацоўніцтва доўжылася на працягу многіх гадоў.

Японскі прэм'ер апынуўся на зневажальным сёмым месцы ў спісах палітыкаў, якіх яго суайчыннікі хацелі б бачыць у крэсле кіраўніка ўрада краіны. Такі фенаменальны вынік далі апытанні грамадскай думкі, праведзеныя зусім незалежна адзін ад аднаго двума вельмі буйнымі і ўплывовымі прыватнымі тэлекампаніямі — Fuji TV і TBS. Рэйтынг урада Японіі на чале з прэм'ерам Фуміё Кісіда абваліўся да рэкордна нізкай адзнакі ў 17,1 працэнта, сведчаць вынікі апытання, праведзенага агенцтвам Jiji. Паводле вынікаў апытання грамадскай думкі, праведзенага тэлеканалам Fuji TV і газетай «Санкэй», больш чым 40 працэнтаў жыхароў Японіі жадаюць, каб Фуміё Кісіда як мага хутчэй пакінуў сваю пасаду.

Прэм'ер сутыкнуўся з абвальным падзеннем рэйтынгаў і спрабуе здаць сваіх найбліжэйшых паплечнікаў, каб перакласці на іх адказнасць і захаваць сваё крэсла любой цаной. Таму верагодна, што японскі «міністрапад» пачнецца ўжо ў найбліжэйшыя дні.

Захар БУРАК.

Песня пра зубра на новы лад

З вякоў мінулых

Белавежская пушча — гэта не толькі помнік прыроды, але і помнік гісторыі, прычым гісторыі ад самага яе пачатку. Першабытны чалавек пакінуў свой след на гэтай тэрыторыі яшчэ ў VII тысячагоддзі да нашай эры, менавіта да гэтага перыяду адносяцца першыя археалагічныя знаходкі. Тут прырода стварыла ўсе ўмовы для жыцця: вады хапае, каменю для вырабу прылад працы — больш чым дастаткова, лес кішыць жывёламі. Жыві не хачу.

Археалагічны музей пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы — адзіны ў нашай краіне музей, які не проста дае ўяўленне, а рэальна паказвае гісторыю людзей ад каменнага веку (IX тысячагоддзя да нашай эры) і да ранняга Сярэднявечча (X стагоддзе нашай эры). Сучасныя спецыялісты правялі вялізную даследчую і археалагічную работу, каб узнавіць перадамы, у якіх ужо ўзгадваюцца рысы сучасных дамоў — два пакоі, невялікі калідор, акенцы. Прасочваецца, як развіваюцца промыслы і рамёствы — прылад працы становіцца больш, яны ўжо больш дасканалыя і зручныя.

Як вядома, вывучэнне гісторыі пачынаецца з гісторыі старажытных часоў. Настолькі далёкіх, што, чытаючы іх гісторыю з сучасных кніг ці электронных носьбітаў, цяжка ўявіць, як там усё было. Археалагічны музей у Белавежскай пушчы рэальна паказвае, як жылі першабытныя людзі, чым займаліся і на што былі здольныя. А такая інфармацыя заўжды запамінаецца лепш. Праўда, вельмі хацелася б, каб нешта з заняткаў таго часу сучасныя людзі маглі паспрабаваць самі. Сёння проста пацерці камень аб камень і тым самым выклікаць агонь — незвычайны атракцыён, які прынясе яшчэ больш непаўторных уражанняў ад наведвання археалагічнага музея.

шабытныя стаянкі эпохі каменнага веку. У музеі ўпершыню прадстаўлены жыллёвыя пабудовы па тыпе «чумаў» з жэрдак, крытых шкурамі жывёл, пластамі кары і саломай. Пасяленне бронзавага веку ўзноўлена па матэрыялах тштынецкай археалагічнай культуры II тысячагоддзя да нашай эры. У кожнай «хатцы» прадстаўлены прадметы побыту, прылады працы. Нават інтэр'еры адпавядаюць тагачаснай рэчаіснасці, ну наколькі мы цяпер можам аб тым меркаваць. Шпацыр па археалагічным музеі — гэта як падарожжа на машыне часу. Ад бронзавага стагоддзя да Сярэднявечча. І адразу адчуваеш, як са зменамі эпох людзі сталі жыць лепей. На змену чумам прыходзяць

Падарожжа на машыне часу працягваецца і ў музеі народнага побыту. Экспазіцыя паказвае, як жылі нашы продкі ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Вялікім адкрыццём для гасцей гэта не стане, бо кожны хоць раз быў у звычайнай беларускай хаце. Але ж як тут утульна! А гасцям прапаноўваюць традыцыйныя пушчанскія пачастункі. Каб даведацца, якія, трэба ехаць у Белавежскую пушчу.

На прыём да імператара...

Наведаць Белавежскую пушчу трэба ў першую чаргу для таго, каб захапіцца ўнікальнай прыродай. Усё ж такі гэта яе царства. Тым, хто не проста захапляецца, але яшчэ і глыбока цікавіцца прыродай, варта завітаць у музей прыроды нацыянальнага парку. Па багацці ён лічыцца адным з найлепшых музеяў свайго профілю ў Беларусі. У сямі залах прадстаўлена разнастайнасць флоры і фаўны Белавежскай пушчы. Прычым некаторых прадстаўнікоў сёння ў пушчы ўжо не сустрэць. Ды і ў ніякіх лясах іх не сустрэнеш. У музеі прадстаўлены чучалы жывёл, якія ўжо вымерлі. Самы велічны — легендарны тур. Калісьці гэтыя магутныя быкі насялялі тэрыторыю Белавежскай пушчы і карысталіся пашанай у паляўнічых. Кубак з рога тура лічыўся найлепшым падарункам. На жаль, ад такой вялікай пашаны яны і вымерлі.

У музеі прадстаўлена і гісторыя пушчы, якая, як і гісторыя кожнай дзяржавы, насычана рознымі шчаслівымі і трагічнымі часамі. Белавежская пушча бачыла шмат «мокрых свету гэтага». У 1409 годзе польскі кароль Ягайла і князь ВКЛ Вітаўт падчас палявання здабылі шмат лясных звяроў. Іх мяса запаслі на будучую вайну з Тэўтонскім ордэнам. Вітаўту і Ягайлу вельмі спадабаліся тарпанавідныя коні, якія жылі ў гэтых лясах. Вельмі моцныя, вынослівыя коні, як кажуць экскурсаводы музея, «маглі напіцца ранішняй расой» — лепшага памочніка на вайне знайсці цяжка. Такім чынам, можна сказаць, што ў Белавежскай пушчы была закладзена першая цаглінка перамогі ў вайне з Тэўтонскім ордэнам. У часы расійскага імператара Аляксандра III Белавежская пушча знаходзілася ва ўласнасці царскай сям'і. Імператар разумеў культурна-гістарычнае значэнне пушчы і неабходнасць яе аховы, сачыў за яе станам. Але і паляваць у гэтых лясах члены царскай сям'і вельмі любілі. Праўда, вялікія царскія паляванні праводзіліся раз на тры гады, каб колькасць жывёл паспела аднавіцца. У 1894 годзе ў Белавежскай пушчы быў пабудаваны царскі палац, які стаў асенняй рэзідэнцыяй апошніх рускіх цароў Аляксандра III і Мікалая II. Праўда, палац застаўся на польскай частцы пушчы і ў XX стагоддзі быў разбураны. А на Беларусі застаўся толькі яго макет, які захоўваецца ў музеі прыроды. Шмат няшчасцяў прынесла пушчы Першая сусветная вайна. У жніўні 1915 года яе тэрыторыя была акупавана нямецкімі войскамі, якія адразу пачалі актыўна высякаць каштоўныя векавыя дрэвы. Прагаліны ад высечаных палян і сёння, нібы шнары, нагадваюць аб тых трагічных часах. Але пушча ўзнавілася і працягвае радаваць сваіх гасцей.

Асабліва турыстаў радуюць гаспадары лесу — жывёлы. З імі можна пазнаёміцца бліжэй каля экскурсійных вальераў. У гэтым невялікім лясным заапарку можна блізка ўбачыць аленяў і касуль, ваўкоў і мядзведзяў, зразумець, чаму Ягайлу спадабаліся тарпанавідныя коні, захапіцца моцнымі птушкамі, сярод якіх пугач вялікі і арлан белахвосты. Найбольшую ўвагу, ад якой, відавочна, атрымлівае задавальненне, выклікае імператар Белавежскай пушчы — зубр. Страшна ўявіць, што гэтага сімвала Белавежскай пушчы, ды і ўсёй краіны магло б не быць. Першая сусветная вайна стала фатальнай для іх папуляцыі. У 1915 годзе налічвалася каля 300 жывёл, затым іх колькасць паступова скарачалася. А ў 1919 годзе ў Белавежскай пушчы была забіта апошняя зубрыца. Усяго ў той час у заапарках іншых краін заставалася ўсяго 52 зубры, якія калісьці былі вывезены з Белавежскай пушчы. На шчасце, у 1920-х гадах пачалося аднаўленне гэтага віду ў Беларусі. Работа, якая стала на паўзу з пачаткам Другой сусветнай вайны, пасля яе заканчэння аднавілася. У 1950 гадах пушчанскіх веліканаў разводзілі ў спецыяльна створаных для іх гадавальніках і паступова выпускалі на волю. Сёння ў Белавежскай пушчы жыве больш за 700 зуброў. І гэта вялікае дасягненне, бо яшчэ Мікола Гусоўскі ў знакамітай «Песні пра зубра» пісаў, што «звер гэты цудам толькі шчэ ў нас захаваўся пад зоркай Палярнай». Цікавы факт — у зубрыным статку пануе матрыярхат, магутныя зубры пакорліва слухаюць старэйшую зубрыцу. А яшчэ, нягледзячы на свае памеры, зубр досыць грацыёзная жывёла — спецыялісты сцвярджаюць, што ён з месца можа пераскочыць двухметровы плот. На ўдачу турыстаў, у экскурсійных вальерах ён сабе такога не дазваляе. Але з гонарам падыходзіць да гасцей і праз загарадзь прымае пачастунак, паказваючы, што ён хоць і выглядае грозным, але ў душы досыць мілы.

І ў госці да казкі

Водгаласы песні зубра гучаць у Белавежскай пушчы літаральна паўсюль. На месцы былога гадавальніка, дзе калісьці лясны велікан атрымаў другое жыццё, сёння размешчана славутасць, дзеля якой кожную зіму дзясяткі тысяч людзей бяруць курс на Белавежскую пушчу, — сядзібу беларускага Дзеда Мароза. Сёлета ў яе юбілей — 20 гадоў з моманту адкрыцця. Здаецца, беларускі Дзед Мароз жыў у Белавежскай пушчы заўсёды. Аднак не, афіцыйную прапіску атрымаў толькі ў 2003 годзе. Наведваючы сядзібу, сапраўды апынаешся ў казцы, сустракаеш знаёмых з дзяцінства герояў і толькі паспяваеш загадваць жаданні — Дзед Мароз на цуды не скупіцца. І ўсё гэта ў старажытным лесе, пад шатамі векавых дрэў, бо сядзіба знаходзіцца ў самым цэнтры Белавежскай пушчы. Гасцей Дзеда Мароза на шляху да казкі сустракаюць дрэвы, якія размянялі больш за тры стагоддзі. Такія дрэвы лічацца лячэбнымі, таму ўсім гасцям Белавежскай пушчы раяць абняць ствол (ну, на колькі хопіць рук) і спакойна пастаяць некалькі хвілін, насыціцца іх энергетыкай.

Такі прыродны антыстрэс разам з радасцю ад зносін з жывёламі, новымі цікавымі ведамі, насычаным водарам лясным паветрам падарожжа кожнаму госцю цэлы комплекс непаўторных уражанняў. Пра Белавежскую пушчу можна казаць бясконца, але лепей яе хоць адзін раз убачыць, каб зразумець велічы і ўнікальнасць гэтага месца. Тым больш што гэта не так складана. Падчас круглага стала па выніках выязнога семінара **Ніна БОГУШ, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага парку «Белавежская пушча»,** адзначыла, што тут створаны ўсе ўмовы для адпачынку, а гасцей (якія прыйшлі з добрымі намерамі) тут заўсёды рады бачыць.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Лізаветы ГОЛАД.
Белавежская пушча.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КАСМІЧНЫ МАШТАБ ЯГО МЫСЛЕННЯ

Паказвае новы фільм пра Аляксандра Кішчанку

Прэм'ерай новага дакументальнага фільма пра народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанку студыя гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» адзначыла сваё шаснаццацігоддзе. На паказ, які адбыўся ў кінатэатры «Беларусь», сабралася поўная зала прыхільнікаў. Уладзімір Бокун распавёў пра той шлях, які студыя прайшла за шаснаццаць гадоў існавання, пра гісторыю стварэння і адданых прафесіяналаў, якія на студыі працавалі і працуюць. На сёння студыя гістарычных фільмаў мае ўражлівы творчы багаж: адных толькі выпускаў праекта «Зваротны адлік» — 319, 15 фільмаў праекта «100 імён Беларусі», сем фільмаў серыі «Хроніка Мінскага гета», 20 — цыкла «Асобы», 11 — праекта «Ад першай асобы», у якім вядомыя дзеячы паказваюцца праз асабістае, праз іх адносіны з сябрамі і блізкімі.

Высокі ўзровень твораў студыйцаў пацвярджаюць шматлікія ўзнагароды. На нядаўнім фестывалі «Лістапад» фільм рэжысёра Уладзіміра Луцкага «Лахва. Цана свабоды» пра паўстанне ў гета маленькага беларускага мястэчка атрымаў спецыяльны прыз журы. І падчас святкавання шаснаццацігоддзя студыі адна з такіх узнагарод знайшла ўладальніка. Фільм «За нашу Перамогу» стаў лаўрэатам сочынскага кінафестывалю імя Уладзіміра Мяньшова «Перамаглі разам». Маладая рэжысёрка Кацярына Шарамет не змагла паехаць на ўручэнне ў Сочы, і прыз ёй быў прывезены і ўрачыста перададзены ў Мінску. Сярод цікавостак сустрэчы было яшчэ і знаёмства з анімацыйнай стужкай пра Міколу Гусоўскага, знятай з прыцягненнем самых сучасных тэхналогій маладой рэжысёркай, дачкой Уладзіміра Бокуна.

Фільм «Аляксандр Кішчанка. Касмічная Адысея» з цыкла «Ад першай асобы», які стаў галоўнай падзеяй імпрэзы, змусіць многіх па-новаму зірнуць на постаць мастака, вядомага сваімі мазаікамі на дамах па праспекце Незалежнасці насупраць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і грандыёзным «Габеленам веку», занесеным у Кнігу рэкордаў Гінеса. У якасці сцэнарыста выступіла вядомы мастацтвазнаўца Надзея Усава. Дзякуючы ёй, у фільме прагучала шмат цікавых фактаў, якія датычацца і асабістага жыцця мастака, і яго не заўсёды спрыяльных стасункаў з калегамі. Напрыклад, не ўсім вядома, колькі перыпетый узнікла падчас стварэння мазаікі на праспекце Незалежнасці — работу прыпынялі, смальту, з цяжкасцю здабытую, расцягвалі. Зайздроснікі арганізоўвалі нават лісты «незабыкавых грамадзян» у ДАІ — сцвярджалася, што ўвага кіроўцаў будзе адцягвацца на новыя мазаікі, у выніку ўзнікнуць аварыі. На шчасце, у ДАІ адмовіліся ад падобных опусаў з гумарам.

Фільм паказвае «касмічны маштаб» мыслення Аляксандра Кішчанкі, што падкрэсліваецца панарамнымі аэраздымкамі. Раскрываюцца вытокі яго незвычайных вобразаў — аказваецца, таямнічыя «парталы», шэрагі квадратаў на габеленах і карцінах натхнёныя беларускім народным арнаментам і саломапляценнем і нават канкрэтным шэдэўрам — саламянымі царскімі варотамі, што захоўваюцца ў Раўбіцкім музеі беларускага народнага мастацтва.

На прэм'еры прысутнічала ўдава мастака Ніна Кухарэнка. У фільме яна зачытвае яго апошнія запісы, якія гучаць як сапраўдны філасофскі запавет, заклікаючы да самаўдасканалення і творчасці.

Людміла ІВАНОВА.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ИТСУП «Мультимоторс» (УНП 190736341, г. Минск, ул. Могилевская, 43а, комн. 1)

***Дата и время проведения торгов*: 28 декабря 2023 года.**
Начало – 12.00, окончание – 14.00. Заявки принимаются с 16 декабря 2023 года по 26 декабря 2023 года.
Место проведения торгов: Минск, проспект Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ИТСУП «Мультимоторс» (УНП 190736341)** в лице ликвидатора – Радченко К.И., тел. 8 (029) 156-86-96.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена лота, руб., с учетом НДС по ставке 20 %	Шаг торгов	Задаток
1	**Легковой внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL) CHANGAN CS 75 FL; год выпуска – 2020; регистрационный номер 4888 ВА-7; кузов (VIN) N - LS4ASE2W8LJ104605**	**48 816,00**	5 %	1 %

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 15.00 26 декабря 2023 года перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 26 декабря 2023 года заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 12.07.2013), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов (соглашение о выплате аукционного сбора). **Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406; время с 9.00 до 16.00 в рабочие дни.**

Телефон для ознакомления и осмотра лота в рабочие дни: +375291568696, Радченко Кирилл Игоревич; +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три рабочих дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

- заявление подано только одним участником или для участия в торгах явился только один участник;
- для участия в торгах не было подано ни одного заявления или ни один из участников не явился.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

